Пролетарыяты ўсіх краін, аб'ядніцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 36 (2224) Субота, 11-га лютага 1928 г.

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.

АДРЭСОВАНЫЯ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародзяе	— 30 к.
сяскоўцы	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шпальтовага тэксту	— р. 50 к.
За радок шпальтовага тэксту	1 р. — к.
За радок шпальтовага перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпіцмыя на 50 проц. дарожэй.

Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Бесапрацоўн. і чырвонаармейцы	
за дакумэнт	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

Напярэдадні парляманцкіх выбараў на Захадзе.

Заходняя Эўропа ўваходзіць у паласу перадвыбарчай гарачкі, якая кладзе асобны адбітак на ўсю палітыку буржуазных урадаў.

Буржуазныя партыі вельмі канкуруюць адна з другою з-за галасоў выбаршчыкаў. Не адстаюць і рэфармісты. Яны бяруць курс то на заваёву галасоў дробнай буржуазеі, то прыкрываюцца левымі фразамі, каб хоць-бы ў апошнюю хвіліну ўтрымаць за сабой рабочых выбаршчыкаў. Усюды выглядае агідны твар буржуазнай дэмакратыі, уся сутнасьць якой у тым, каб увесьці ў блуд працоўныя масы. Скрываючы свой сапраўдны клясавы твар, капітал імкнецца закабаліць працу на «законных» падставах, іншымі словамі, атрымаць «адобраньне» выбаршчыка.

Гэты малюнак з нязначнымі зьменамі паўтараецца кожны раз, калі надыходзяць перавыбары. Толькі на гэты кароткі час славутая «дэмакратыя» дыктатуры капіталу пачынае прыкрывацца прыгожымі фразамі, ведаючы, што яна толькі і клапаціцца аб шчасьці народу. Ужо на другі дзень пасьля абраньня таго ці іншага парляманту ўся гэта кліка ад махровых рэакцыянэраў да салодкіх «сацыялістаў» забывае аб сваіх абяцаньнях і зноў бярэцца за выкананьне сваёй асноўнай задачы—прыгнечаньня і эксплёатацыі працоўных «сваёй» краіны і «сваіх» калёній.

І ўсё-ж клясавую барацьбу ніяк не ўдаецца буржуазеі падпарадкаваць сабе. У Нямеччыне «левыя» буржуазныя партыі, у тым ліку і сацыял-дэмакраты, са скуры вылупляюцца, каб задушыць рабочы рух і хоць-бы на кароткі час справу абярнуць так, вібы «на Шыпцы ўсё спакойна». Тым ня менш у Сярэдняй Нямеччыне і ў Саксоніі ні на адзін дзень ня спыняецца ўпартая барацьба мэталістаў за мажлівыя ўмовы існаваньня. Папоўская партыя цэнтру прымушана весьці гульню з рабочымі, далучанымі да каталіцкіх прафсаюзаў, каб утрымаць іх ад зруху ўлева. Па сутнасьці мы маем у Нямеччыне адзіны фронт ад нацыяналістаў да згодніка́ў і ўсё больш моцнае рэвалюцыянізаваньне ў пралетарскім лягеры.

У Польшчы перавыбарчая барацьба ўжо ідзе поўным ходам. Яе адзнакай зьяўляецца нячуваны тэрор супроць рэвалюцыйных элемэнтаў. У гэтым цкаваньні адполькава бяруць удзел рэакцыянэры-абшарнікі і «сацыялісты». Не выпадковым зьяўляецца, што ў галоўнай выбарчай камісіі супроць сьпісу рабоча-сялянскага адзінства выступіла меншавіцкая партыя ППС, а суд і паліцыя выконвалі тую-ж волю капіталу з другога канца. Гэта і зразумела: меншавікі ня менш за капіталістаў палохаюцца перамогі рэвалюцыйных элемэнтаў. А што гэтая небясьпека зьяўляецца рэальнай, довадам служыць посьпех рэвалюцыйных элемэнтаў на мінулых выбарах у органы самакіраўніцтва ў Варшаве, Лодзі і інш.

Француская буржуазея да надыходзячых выбараў яшчэ рыхтуецца і шляхам пушчаньня пылу ў вочы масам і шляхам іх застрашваньня. З аднаго боку буржуазея спрабуе высунуць Пуанкарэ нацыянальным героем, а з другога—карыстаецца ўсімі сродкамі ў сваёй расправе з камуністамі, арыштоўваючы іх лідэраў, канфіскуючы газэты і інш.

У Англіі кароль спрабуе паставіць справу так, нібы ў Англіі і няма глыбокага прамысловага крызісу, няма мілённага беспрацоўя, няма бязупынных непарадкаў у калёніях і інш. Наўрад ці гэта можа каго-небудзь ашукаць і заспакоіць. Катастрафічнае абвастрэньне англа-амэрыканскага спаборніцтва з-за рынкаў спрабуюць адсунуць тым, што аб гэтым маўчаць і інш.

Заходня-эўрапейская буржуазея пачынае перадвыбарчыя манэўры старымі сродкамі. Яна не заўважае таго, што масы досыць ужо вырасьлі, каб бачыць і разьбірацца ў тым ашуканстве, якім іх стараюцца абкружыць ужо ня першы раз. Гэтыя сродкі ўжо вельмі старыя, і ўсё меншы лік рабочых пападае на кручок буржуазнай дэмакратыі, усё больш улёляючы сабе ідэі Камінтэрну.

Сялянскія непарадкі у Грэцыі.

АФІНЫ. У зьвязку з перамовамі грэцкага міністра фінансаў Кафандарыса ў Лёндане аб пазыцы, грэцкі ўрад узмацніў нажым на зборы падаткаў, чым выклікаў непарадкі сярод сялян, галоўным чынам, на высьне Крыце. У Іраклійе ўвайшло 3 тысячы узброеных сялян, да якіх далучылася ўсё працоўнае жыхарства гораду. Асадзіўшы прэфэктуру, сяляне ўльтыматыўна патрабавалі фінансавых палёгак, даўшы для выкананьня патрабаваньняў тыднёвы тэрмін і абяцаўшы ўжыць сілу ў выпадку адмовы. Прэфэкт не адважыўся выклікаць войска, баючыся яго ненадзейнасьці.

Незадоўга да гэтых падзей сяляне ў мястэчку Мірах спалілі паперы падатковае інспэкцыі. Пасьля падзей у Іраклійе арыштаваныя ўдзельнікі непарадкаў у Мірах былі вызвалены.

Урад пасьпяшаўся агаласіць паведамленьне, у якім гаворыцца, што сыстэма збору падаткаў будзе зьменена ў сэнсе адначасовага забясьпечаньня інтарэсаў скарбу і выплатчыкаў падатку.

Адстаўка грэцкага ўраду.

АТЭНЫ, 4-II. Учора габінэт Займіса падаўся ў адстаўку. Непасраднаю прычынаю да адстаўкі паслужылі розногалосьсі між міністрам земляробства Папанастасіу і іншымі членамі габінэту па пытаньні аб здачы канцэсіі на пабудову шляхоў. Больш агульныя прычыны адстаўкі габінэту ў розногалосьсях на глебе ня каторага ўхіленьня Папанастасіу налева, у той час, як агульная палітыка габінэту наадварот ухілялася ўправа.

На працэсе т. Сьцяфанава.

ВЕНА, 7-II. Румынскі друк паведамляе, што на працэсе Сьцяфанава пры допыце абвінавачанага старшыня, у адказ на зазначэньні Сьцяфанава аб правільнасьці пэрспэктыў, якія ўстанаўляюцца камуністычнай партыяй, гіранічна заўважыў: «А ссылку Ракоўскага вы таксама прадбачылі?

«Сьцяфанаў адказаў: «Зразумела, Ракоўскі зрабіў цяжкія злачынствы проці савецкае ўлады і мае за гэта заслужаную кару».

Абаронца Сьцяфанава заўважыў: «Весткі аб ссылцы Ракоўскага няпэўныя». Сьцяфанаў, аднак, паправіў абаронцу і ізноў выказаўся цалкам за абарону заходаў, ужытых проці Ракоўскага і інш. сяброў апазіцыі ва УсеКП(б)

Ацэнка прамовы Штрэзэмана.

БЭРЛІН, 7-II. „Дойчэ Альгемэйнэ Цэйтунг" прысьвечвае як відаць інсьпіраваную чарадавіцу цытаньню аб выніках абмену прамовамі між Штрэзэманам і Брыянам. Як відома, некаторыя нямецкія газэты заяўлялі, што прамова Штрэзэмана ў сучасны момант нэмэтазгодна. Гэтыя газэты лічылі нават, што Штрэзэман не павінен быў наогул узьнімаць цытаньня аб эвакуацыі Рэйнскае вобласьці. «Дойчэ Альгемэйнэ Цэйтунг» выступае проці гэтага пункту гледжаньня і заяўляе, што бюджэт міністэрства замежных спраў абмяркоўваецца толькі адзін раз у год, і таму міністр замежных спраў абавязан закрануць усе пытаньні, якія закранаюць нацыянальную годнасьць і суверэнітэт Нямеччыны.

„Палёты добрапажаданасьці" Ліндбэрга.

АНТЫАМЭРЫКАНСКАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ Ў ГАІЦІ.—ЛЁЗУНГІ Ў ЧЭСЦЬ НІКАРАГУАНСКІХ ПАЎСТАНЦАЎ.

НЬЮ-ЁРК, 7-2. Амэрыканскі лётчык Ліндбэрг, які робіць «палёты добрапажаданасьці» па краёх Цэнтральнае Амэрыкі, прыляцеў у Гаіці. Напярэдадні прылёту ўрад Гаіці зачыніў два клюбы нацыяналістаў і дзве нацыяналісцкія газэты. У Гаіці прыплылі два вайсковыя судны Злучаных Штатаў, якія высадзілі матросаў. Аэрадром, на якім зьнізіўся Ліндбэрг, быў нерапоўнены амэрыканскімі матросамі і гаіцянскімі салдатамі. Правадыры партыі незалежнасьці байкатавалі прыезд Ліндбэрга. З прычыны яго прыезду былі вывешаны плякаты з надпісамі: «Няхай жыве правадыр нікарагуанскіх паўстанцаў Сандзіно»

У АМЭРЫЦЫ 4 МІЛЬЁНЫ БЕСПРАЦОЎНЫХ.

НЬЮ-ЁРК, 8-II. Водзуг вестак лібэральна-рэфармісцкае статыстычнае ўстановы „Лейбор Бюро", лік беспрацоўных у Злучаных Штатах складае 4 мільёны. Даныя гэтыя не абасінованы на дакладных лічбах з прычыны адсутнасьці рэгістрацыі беспрацоўных у Злучаных Штатах.

„Адзінае" кіраўніцтва поўднем Кітаю.

НОВЫ СКЛАД НАНКІНСКАГА ЎРАДУ.

ГОКІЁ, 9-II. Шанхайскі карэспандэнт «Цзэі-Цзэі» паведамляе, што нанкінскі ўрад назначыў Сюэ-Ду-Бі (грамадзянскі губарнатар правінцыі Ганьсу, у мінулым займаў шмат вышэйшых пасад, стаўленік Фынь-Юй-Сяна) міністрам унутраных спраў, былога шанхайскага гарадзкога галаву Хуан-Фу—міністрам замежных спраў, Сун-Цзэі-Вэна (брат удавы Сун-Ят-Сэна)—міністрам фінансаў, Ван-Пан-Чжуна (правы гаміндановец)—міністрам шляхаў і Ван-Чжун-Куя—міністрам юстыцыі.

„Адзінство" без адзінства.

ТОКІЁ, 9-2. 4-ты пленум выканкому Гаміндану арганізаваў новы «урадавы камітэт» у складзе 47-мі сяброў, у тым ліку: Тан-Ен-Кай (старшыня ўрадавае рады, якая складаецца з 7-мі сяброў), Чан-Кай-Шы, Фынь-Юй-Сян, Ен-Сі-Шан, Лі-Ці-Сін (кантоскі дыктатар), Лі-Цзу-Жэн (дубань правінцыі Гуансі), Бай-Цзун-Чы і інш.

Вайсковая рада, утвораная пленумам Гаміндану, складаецца з 73-х сяброў.

УВАГА: памянёны склад урадавага камітэту не зьяўляецца адбіткам сапраўднага становішча ў Гаміндане, бо ў яго ўведзена некалькі асоб, як напрыклад, Бай-Цзун-Чы і іншыя прадстаўнікі Гуансійскае групоўкі, варожае нанкінскаму ўраду. Уключэньне іх у склад „урадавага камітэту" зьяўляецца выключна фармальным актам, разьлічаным на дэманстрацыю адзінства ўнутры Гаміндану.

РЭВАЛЮЦЫЙНЫ НАСТРОЙ ШАНХАЙСКІХ РАБОЧЫХ.

ШАНХАЙ, 25-1. Забастоўка рабочых англа-амэрыканскае тытуневае кампаніі, якая цягнулася ад кастрычніка месяца, скончылася. Дасягнута згода.

Перад аднаўленьнем працы на тэрыторыі аднае з фабрык адбыўся мітынг рабочых, на якім у вялікай колькасьці былі распаўсюджаны пракламацыі, падпісаныя падпольнаю шанхайскаю радаю прафсаюзаў рабочых Чан, які распаўсюджваў іх, быў арыштаваны. Баючыся далейшых выступленьняў з боку прыхільнікаў рады прафсаюзаў і камуністаў, вайсковая ўлада выслала атрад узброеных салдат для нагляду за рабочымі, а тэрыторыі, на якіх разьмяшчаны фабрыкі, абвешчаны на ваенным становішчы.

АНГЕЛЬСКІЯ АГЕНТЫ ФАШЫЗУЮЦЬ КІТАЙ.

ПЕКІН, 27-1. Рэакцыйны ангельскі орган у Шанхаі „Норд Чайна Дэйлі Ньюс" паведамляе, што на апошнім пасяджэньні шанхайскіх фашыстаў была выпрацавана праграма і статут арганізацыі і зацьверджаны выбары камітэту.

Старшынствуючы на сходзе лідэр арганізацыі, ангельскі камэрсант Фойрст, у сваёй прамове, між іншым, заявіў: „Фашысты праробілі вялікую працу з мэтаю перашкодзіць кітайскую грамадзянасьць і ўладу ў неабходнасьці высылкі савецкіх прадстаўнікоў. Нанкінскі ўрад заслугоўвае ўсялякае пахвальбы, але нам нельга супакоіцца. Наша праца толькі кінер распачынаецца і канчацца толькі пасьля канчатковага зьнішчэньня ўсіх рэшткаў бальшавізму".

КАМУНІСТЫЧНЫЯ АТРАДЫ Ў ХУБЭІ.

ШАНХАЙ, 9-2. Паведамляюць, што ў Ханчуанскім павеце правінцыі Хубэй зьявіліся камуністычныя атрады, да якіх далучаюцца ўзброеныя сяляне.

ПАРТЫЗАНЫ Ў РАЙЁНЕ ХАНЬКОУ.

ШАНХАЙ, 9-2. Партызанскія часьці, кіруемыя камуністамі, нанесьлі паражэньне войску ханькоўскае ўлады ў некалькіх стычках у лагчыне рэчкі Хан. Апошнімі дкямі партызанскія атрады зьявіліся ў непасрэднай блізкасьці да Ханькоу.

АПЭРАЦЫІ КАМУНІСТЫЧНАГА ВОЙСКА Ў ГУАНДУНІ.

ШАНХАЙ, 9-II, З Гапконгу паведамляюць, што рэвалюцыйнае войска, кіруемае камуністамі, заняло горад Кайін (на паўночным усходзе Гуандунскае правінцыі) і пакінуві гарады Шінсян, Юнфун і Ванан у правінцыі Цзянсі.

ПАДПОЛЬНЫ КАМСАМОЛ У ШАНХАІ.

ШАНХАЙ. 9-II. «Шанхай Мэркуры» заяўляе, што ў Шанхаі арганізавана „таварыства чырвонае моладзі", якое імкнецца да распаўсюджаньня камунізму на поўдні Цьзянсу.

Крытычны момант нямецкай стачкі.

НАЖЫМ ПРАМЫСЛОЎЦАЎ.

БЭРЛІН, 9-II. Учарайшыя перамовы ў міністэрстве працы аб ліквідацыі канфлікту ў мэталюргічнай прамысловасьці Сярэдняе Нямеччыны не далі ніякіх вынікаў. Саюз прамыслоўцаў пагражае мэталістам лёкаутам у агульна-нямецкім абхваце, калі канфлікт ня будзе пагоджаны бліжэйшымі днямі. Працяг перамоў заўтра.

ЛЁКАУТ.

БЭРЛІН. У Кілі адміністрацыя вэрфі абвясьціла лёкаут нібы з прычыны забастоўкі 229 майстроў, без якіх, па думцы адміністрацыі, праца на вэрфі немагчыма.

Лёкаут ахапіў 6.750 рабочых.

РЭФАРМІСТЫ ГВАЛТОЎНА САРВАЛІ ПАШЫРЭНЬНЕ БАРАЦЬБЫ.

БЭРЛІН, 9-II. Кіраўнікі прафсаюзаў інструментальных рабочых затрымалі правядзеньне ў жыцьцё пастановы бэрлінскіх інструментальшчыкаў аб забастоўцы „пакуль будуць вычарпаны ўсе сродкі вырашэньня канфлікту мірным шляхам". Аднак, перамовы між прадпрыёмцамі і прадстаўнікамі рабочых на мелі посьпеху, бо прадпрыёмцы адмовіліся ад усякіх уступак. Адбыўся дэлегацкі сход інструментальных рабочых, які патрабаваў неадкладнага абвяшчэньня забастоўкі. Кіраўнікі прафсаюзаў аднак парачылі проці гэтага патрабаваньня, на гэты раз пад прытычкаю, што забастоўка будзе для прадпрыёмцаў выгадным момантам для абвяшчэньня агульнага лёкауту мэталёўцаў. З тае прычыны, што большасьць сходу выразна стала за абвяшчэньне забастоўкі, кіраўнікі прафсаюзу абвясьцілі, што яны з-за тактычных меркаваньняў ня могуць дапусьціць галасаваньня".

Ліст Кука і Гасіпа мэталёўцам-стачачнікам.

БЭРЛІН. Камуністычная газэта „Клясэнкампф", якая выходзіць у Гальле, агаласіла ліст Кука і старшыні ангельскага прафсаюзу дрэваапрацоўчнікаў Гасіпа, якія выказваюць салідарнасьць ангельскіх рабочых з нямецкімі мэталёўцамі.

На тым-жа месцы.

СПРАВА З ЭВАКУАЦЫЯЙ РЭЙНСКАЕ ВОБЛАСЬЦІ.

ЛЁНДАН, 9-II. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: Адказваючы на запытаньне ў палаце вобшчын, таварыш міністра замежных спраў Лёкер Лемпсон заявіў: «Пытаньне аб вывадзе ангельскага акупацыйнага войска з Рэйнскае вобласьці без пагожаньня з іншымі дзяржавамі — ня ўзьнімалася. Такія ўчынкі ў сучасных умовах на мой погляд не далі-б нічога добрага. Вызваленьне да тэрміну Рэйнскае вобласьці можа адбыцца толькі ў выніку згоды між усімі зацікаўленымі дзяржавамі і нямецкім урадам. Калі падобная згода ажыцьцёвіцца, дык ангельскі ўрад будзе толькі вітаць яе».

ФАЛЬШ.

ЛЁНДАН, 9-2. Адказваючы ў палаце вобшчын на запытаньне наконт адносін ангельскага ўраду да прапановы Калёга зьнішчыць падводныя лодкі, таварыш міністра замежных спраў Лёкер Лемпсон заявіў, што ангельскі ўрад згодзен зьнішчыць падводныя лодкі толькі пры ўмове, калі яны будуць зьнішчаны адначасова ва ўсіх дзяржавах.

НЯ ВЕРЦЕ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫМ ЗАСТУПНІКАМ.

ТЭЛЕГРАМА Т. САКЛАТВАЛЫ ДА ІНДЫЙСКІХ НАЦЫЯНАЛІСТАЎ.

ЛЁНДАН, 9-2. Орган ангельскае кампартыі „Уоркерс Лайф" зьмяшчае тэлеграму, пасланую ў Індыю Саклатвалаю, у якой ён раіць індыйскім нацыяналістам не падмаўваць сябе наконт „уступак" Саймона.

«Брытанскі ўрад,—заяўляе ён,—ня зьверне ніякае ўвагі на справаздачу любое камісіі, калі яна будзе закрапаць інтарэсы брытанскіх капіталістаў».

Саклатвала заклікае згрупаваць усе сілы на заснаваньні райённых камітэтаў для барацьбы за склік нацыянальна-Устаноўчага збору і прапануе зьвярнуцца непасрэдна да ангельскага пралетарыяту «праз галовы яго імпэрыялістычных лідэраў».

ПРАЦА ЭСТОНСКІХ ФАШЫСЦКІХ СУДОЎ.

РЭВЕЛЬ, 4-2. У Рэвелі скончыўся працэс 7 жанчын, прыцягнутых да адказнасьці па абвінавачаньню ў камуністычнай дзейнасьці.

Усе абвінавачаныя засуджаны да катаргі на тэрмін ад 4 да 6-ці гадоў.

Галоўным пунктам абвінавачаньня служыла праца абвінавачаных у эстонскай сэкцыі МОПР'у.

Заступніцтва сац.-здраднікаў за Троцкага

ВЕНА, 8-2. Орган аўстрыйскае сацыял-дэмакратычнае партыі „Арбэйтэр Цэйтунг" зьмяшчае датаваны 2 лютага і падпісаны лідэрамі II Інтэрнацыяналу, бельгійскім сацыялістам т. Бэбрукерам і нямецкім сацыял-дэмакратам Крысьпіным, ліст да старшыні ЦВК СССР Калініна, у якім яны ад імя камісіі па абсьледваньні становішча палітычных вязьняў пратэстуюць проці высылкі прададыроў апазіцыі УсеКП(б).

БЭРЛІН, 8-II. „Форвэртс" зьмяшчае ліст Бэрбрукера і Крысьпіна да Калініна, у якім яны пратэстуюць проці высылкі апазіцыянэраў, у асобку, Троцкага.

Сьпеў застаўся недапеты.

РЫГА, 5-II. Першае-ж выступленьне прыхаўшага ў Рыгу на гастролі „хору данскіх казакоў", які складаецца з ранейшых урангелеўскіх афіцэраў, скончылася скандалам. Мясцовыя белагвардзейцы ўсялякім чынам імкнуліся абярнуць прыезд хору ў манархічную дэманстрацыю; на вокзале пры сустрэчы, а таксама ў часе канцэрту хору былі падвешаны царскія сьцягі, а сам хор сьпяваў на канцэрце манархічныя песьні. Пасьля канцэрту публіка, якая складалася з белагвардзейцаў, не разыходзілася і сарабавала наладзіць манархічны мітынг, але замест мітынгу вышла пейкае бойства. У выніку прыйшла паліцыя і разагнала белагвардзейцаў, сярод якіх было шмат п'яных. Усе латвійскія газэты, як левыя, так і правыя, выказваюць рашэнне абурэньне проці махінацый манархістаў і процістаўляюць „хору данскіх казакоў" савецкі дзяржаўны хор, які нядаўна прыяжджаў у Латвію. Газэты пішуць, што ў той час, як савецкі дзяржаўны хор паказаў латвійскай публіцы высокія мастацкія дасягненьні, урангельскія афіцэры, выступаючы пад імем „данскіх казакоў", ведуць толькі палітычную гульню, і аб якім-небудзь мэтычным мастацтве іх „хору" і гаварыць ня прыходзіцца

У Польшчы.

ПЕРАДВЫБАРЧЫЯ РЭПРЭСІІ.

«Наш Пшэглёнд» аб забойстве Шварцблейса.

Памянёная газэта падае такія падрабязнасьці забойства прадстаўніка выбарчага сьпісу „Рабоча-сялянскай еднасьці".

«Забойства выканана нячувана зьвярскім спосабам. Вушы і нос ад трупа былі адрэзаны, а галава і плечы страшэнна пакалечаны.

Пры забітым у кішэні знайшлі грошы, што даказвае, што забойства ня выканана з мэтаю рабунку, але—праўдападобна—па палітычным грунце".

Арышты ў Львове.

Часе апошніх арыштаў у Львове затрымана 50 украінскіх дзеячоў, якія абвінавачваюцца ў тым, што пад рознымі фальшывымі палітычнымі фірмамі вялі камуністычную і антыдзяржаўную працу на абшарах чатырох украінскіх ваяводзтваў.

Арышт д-ра Дробнэра.

Гэтымі днямі арыштован левы сацыялістычны дзеяч д-р Дробнэр, арганізатар лева-сацыялістычнай групы так званых «Дробнэраўцаў». Арышт яго, як паведамляюць газэты, знаходзіцца ў сувязі з яго выступленьнем у Быдгошчы, дзе ён заклікаў да клясавай барацьбы.

Польская нота Літве.

«Кур. Віл.» паведамляе, што польскі ўрад на гэтых днях вышле Літве ноту ў адказ на ноту Вальдэмараса. У ноце будуць канкрэтныя прапазіцыі па справе перагавораў з Літвою.

ПОЛЬСКІЯ ПРАПАЗІЦЫІ ЛІТВЕ.

Латвійская «Яўнэйс Зініас» паведамляе, быццам польскі ўрад запрапанаваў Літве польны транспарт праз Польшчу быдла і літоўскага мяса.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

РАЗВОДЗЬДЗЕ І ШТОРМ НА НЯВЕ.

ЛЕНІНГРАД, 10-2. 9-га лютага на паўдзённым узьбярэжжы Балтыцкага мора і па усёй Фінскай затоцы разгуляўся вялікі шторм. Вецер паўдзённа-заходняга напрамку дасягаў сілы ў 10 балаў. Ад 6-й гадзіны ўвечары на Няве распачаўся ўзьлём вады. Найбольшага ўздыму вада дасягнула а 5-й гадзіне раніцы 10-га лютага. У гэты час узровень вады быў на 170 сантыметраў вышэй ардынару. У 10 з паловаю гадзін раніцы вада зьнізілася да 75-ці сантыметраў. Моцным ветрам на Няве і ў каналах пакрышыла лёд, і ў некаторых месцах выступіла з берагоў. У порце вада дайшла да ўзроўню бруку. У гэтым раёне вецер перавярнуў і разьбіў шмат прадуктовых і тытуневых ятак, а таксама пашкодзіў шыбы ў ліхтарох. Дзе-ня-дзе з дамоў пазьдзіраны дахі.

На выспах і ў Новай Вёсцы вада выйшла з берагоў ля 1-га Ялагінава маста і ў некаторых іншых месцах.

Водзуг даных геофізычнае абсэрваторыі, становішча застаецца неспакойным: у працягу дню можна чакаць высокага ўздыму вады. А 1-й гадз. 45 хвіл. ізноў распачаўся моцны паўдзённа-заходні вецер.

Закупка сыравіны без пасрэднікаў.

МАСКВА, 9-II. З бягучага сэзону „Тэкстыль-Імпорт" пераняў закупкі воўны з Эўропы на рынку непасрэдна пастаўляючых воўну краёў—Аўстраліі, Новае Зэляндыі і Паўднёвае Амэрыкі. У Сідзеі адчынена аддзяленьне „Тэкстыль-Імпорту". Першыя нашыя закупкі аказаліся лепшымі па якасьці і больш выгоднымі па цане, чымся закупкі на эўрапейскіх рынках. Спробы ангельскіх і аўстрыйскіх рэакцыйных колаў перашкодзіць нашым апэрацыям не ўдаліся.

Прыклад для іншых.

БАТУМ, 9-II. Сход № Каўкаскага стралковага палка, заслухаўшы даклад аб пазыцы ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі, аднагодна пастанавіў усім складам падпісацца на пазыку. Разам з тым пастановлена, што кожны чырвонаармеец напіша да хаты ліст да сваіх бацькоў з просьбаю ўкласьці свае зьберажэньні ў пазыку ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі.

Упарадкаваньне дастаўкі с.-г. машын.

МАСКВА, 9-II. Калегія НК РСІ СССР пастанавіла ўжыць шэраг мер для палепшаньня дастаўкі сельска-гаспадарчых машын. Калегія лічыць неабходным згуртаваць у руках саюзаў сельска-гаспадарчае кааперацыі склады (і машын і прылад) у тых раёнах, дзе кааперацыя досыць умацавалася ў арганізацыйных і фінансавых адносінах. Прэйс-куранты на сельска-гаспадарчы інвэнтар не павінны зьмяняцца ў працягу апэрацыйнага году. За парушэньне ўстаноўленых гандлёвых накідак вінаватых прыцягваюцца да адказнасьці.

Простыя чыгун. зносіны між Пэрсіяй і СССР.

ТЫФЛІС, 7-2. Сёньня адчынілася савецка-пэрсідзкая канфэрэнцыя па заснаваньні простых чыгуначных зносін між СССР і Пэрсіяй. На першым пасяджэньні выпрацаваны парадак дню канфэрэнцыі. Савецкая дэлегацыя перадала пэрсідзкай для азнаямленьня праэкт чыгуначнае канвэнцыі, разгляд якога па артыкулах адбудзецца на наступным пасяджэньні канфэрэнцыі 9-га лютага.

Фонд „Наш адказ Чэмбэрлену".

МАСКВА. Агульная сума сродкаў, сабраных у фонд «Наш адказ Чэмбэрлену», перавысіла на першага лютага г. г. 8 мілёнаў руб.

ШКОДА АД НЕВЫКАНАНЬНЯ ЎГАВОРАЎ.

МАСКВА, 9-II. Галоўная інспэкцыя ВСНГ СССР расьсьледвала прычыны невыкананьня ўгавораў, падпісаных гаспадарчымі органамі з тэкстыльнаю прамысловасьцю ў асобе Ўсесаюзнага Тэкстыльнага Сындыкату на пастаўку рознае сыравіны і паўфабрыкатаў. З гэтае прычыны былі перабоі ў працы тэкстыльнае прамысловасьці. Выяўлена, што ў пэрагу месцаў асноўнае хімічнае, тлусьцівае і крахмальна-патачнае прамысловасьці няма здавальняючае ўгаворнае дысцыпліны і слаба пастаўлена плянава-камэрцыйная праца. Нарада прызнала, што для ўмацаваньня ўгаворнае дысцыпліны павінны быць ужыты рашучыя меры. Пастаноўлена прасіць прэзыдыум ВСНГ СССР прыцягнуць да адказнасьці (аж да звальненьня з працы) вінаватых у безгаспадарнасьці і зрыве ўгавораў.

Недысцыплінаваныя чыгуначнікі.

ТОМСК. На ст. Тайга 11-га лютага назначан суд над чыгуначнікамі, якія абвінавачваюцца ў парушэньні службовае дысцыпліны, што нанесла значныя шкоды чыгунцы. Выяўлены выпадкі, калі яны машыніст спыняў у дарозе поезд, каб пабіцца з качагарам. Таксама нагнядаліся выпадкі псаваньня запасных стрэлак толькі таму, што стрэлачніку не хацелася ісьці на станцыю за ключом.

Новаайдзеныя россыпы золата.

ЛЕНІНГРАД. Партыя геолёгічнага камітэту выкрыла на прытоках рэчкі Лозьвы (на ўсходніх схілах Ураду) рассыпное золата і платыну.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

Пратэст Літвінава ўраду Злучаных Штатаў.

МАСКВА, 10-II. У 1916 годзе ў Злучаных Штатах загінула ад узрыву вайсковая маемасьць, належачая расейскаму ўраду. Амэрыканскі суд ухваліў пастанову аб звароце страт на карысьць Мукета, які выдае сябе за прадстаўніка названага ўраду.

6-га лютага намесьнік Народнага Камісара па Чужаземных Справах зьвярнуўся ад імя савецкага ўраду з тэлеграмай у міністэрства па чужаземных справах Злучаных Штатаў, у якой заяўляе пратэст супроць выплаты прыватнай асобе грашовых сум, належачых расейскаму казначэйству, і падкрэсьлівае, што Мукет ня мае ніякіх паўнамоцтваў ад савецкага ўраду.

Зазначаючы, што адзіным законным гаспадаром гэтых сум зьяўляецца СССР, без санкцыі якога ніхто ня можа прад'яўляць пратэзіі на гэтыя грошы, тав. Літвінаў заяўляе, што савецкі ўрад пакідае за сабой права прад'яўляць такое патрабаваньне к ураду Злучаных Штатаў, тым больш, што пастанова суду аб выплаце гэтых сум адбылася на аснове перапіскі Мукета з урадам Злучаных Штатаў.

За дзень.

Барацьба за заработак у Чэхаславакіі.

1927 г. быў для Чэхаславакіі таксама як і для ўсёй Нямеччыны годам параўнаўча высокай кан'юнктуры. Але дарагавізна вельмі цяжка адбіваецца на становішчы рабочых, а заработак усё яшчэ застаецца на ранейшым узроўні.

Ня можна лічыць выпадковасьцю, што барацьба за заработак, якая пачалася ў апошнія месяцы мінулага году, узьнікла ў тых галінах прамысловасьці, у якіх асабліва добрыя справы і асабліва нізкі заработак, г. зн. у тэкстыльнай і шкляной прамысловасьці. Ня гледзячы на тое, што заработак тэкстыльшчыкаў вельмі нізкі (12-13 р. у тыдзень), а тэкстыльная прамысловасьць забясьпечана заказамі да сьнежня 1928 году, усё-ж прадпрыёмцы адмаўляюцца весьці перамовы з рабочымі аб павышэньні заработку.

Рэвалюцыйны прафсаюз тэкстыльшчыкаў прапанаваў агульнае выступленьне ўсіх тэкстыльшчыкаў пры падтрыманьні ўсяго чэхаславацкага пралетарыяту. Рэфармісцкі саюз адмовіўся ад агульнае барацьбы і запрапанаваў распачаць барацьбу толькі ў адной акрузе, каб ускласьці ўсю цяжкасьць барацьбы на камуністаў і рэвалюцыйны прафсаюз, якія маюць большасьць у гэтай акрузе.

Аднак, гэтае меркаваньне рэфармістаў не зрабіла належнага ўплыву на рабочых і калі пачалася забастоўка ў Фрыдляндзкай акрузе, яе падтрымала большасьць прадпрыёмстваў, якія знаходзяцца і ў іншых раёнах. Пасьля 8-мідзённай забастоўкі прадпрыёмцы прымушаны былі ўзьняць заработак на 6 проц.

Амаль адначасова з барацьбою тэкстыльшчыкаў пачалася барацьба і ў шкляной прамысловасьці. Прадпрыёмцы пагражалі звольніць рабочых, зачыніць прадпрыёмствы, але ўрэшце і яны прымушаны былі адступіць і задаволіць патрабаваньні рабочых.

Гарнякі таксама ўжо зрабілі першыя крокі да барацьбы. Горнарабочыя Астроўскага раёну высунулі патрабаваньне аб надбаўцы на дарагавізну. Прадпрыёмцы адхілілі гэтае патрабаваньне, матывуючы тым, што ўмовы сусьветнага вугольнага рынку не дазваляюць узьняць заработак і што ва ўмовах яе павышэньня прыдзецца звольніць 30-35 проц. рабочых.

На гэты правакацыйны адказ гарнякі высунулі свой ультыматум у выпадку, як да 21-га лютага ня будуць дазволены патрабаваньні рабочых, яны адкажуць агульнай забастоўкай.

Такім чынам барацьба распачынаецца ледзь не ва ўсіх галінах прамысловасьці Чэхаславакіі. У Чэхаславакіі пачынае разгортвацца клясавая барацьба, якая ня можа не зрабіць адпаведнага ўплыву на рабочых Нямеччыны, Аўстрыі і інш. сумежных дзяржаў.

У чым вульгарызм?

Польская выбарная сыстэма і сучасныя спосабы ўрадавага націску на выбары робяць тое, што грамадзянства Польшчы змушана ісьці на выбары, укладаючыся ў зусім штучныя рамкі.

Мы маем на ўвазе—з аднаго боку—«Беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам», а з другога—«Блёк нацыянальных меншасьцяў».

Як ні дзіўна, а абодвы сьпіскі ўложаны на адзін узор

Пра „далікатнасьць“ і „патэнтованых“ беларусоў.

Ня гледзячы на тое, што досыць шмат савецкіх і партыйных установаў фактычна канчаткова перайшлі на беларускую мову, а ў некаторых спамянёных установах сапраўды шмат ёсьць супрацоўнікаў, якія добра ўладаюць беларускай мовай, што могуць на гэтай мове даваць любыя тлумачэньні,—усё-ж такі пачуць у гэтых установах беларускую мову можна вельмі рэдка.

Чым гэта тлумачыцца?

Тлумачыцца гэта тым, што значны процант супрацоўнікаў гэтых установаў адносіцца да беларусізацыі чыста фармальна. Яны вывучылі беларускую мову для экзамену, для праверкі. Нацкамісія ў часе праверкі вынікаў беларусізацыі напісала, што яны ведаюць беларускую мову здавальняюча. Ну, чачыцца і годзе.

Атрыманыя паперы на беларускай мове яны разумеюць і могуць даць адказ на іх на гэтай жа мове. Ну, чаго вы ад іх яшчэ хочаце?

Але ўжываць беларускую мову ў гутарцы ім нават і ў галаву ня прыходзіла. А ёсьць жа такія ўстановы, дзе супрацоўнікі ня толькі могуць напісаць паперку на беларускай мове, а і дасканала ёю ўладаюць пры размове. Паміж сабою пабеларуску чамусьці не гавораць, за выключэньнем асобных слоў, якія прывіліся ў канцелярскім быту, як, напрыклад: «справа», „абежнік“, «тэрмінова», а часам: „выбачайце“, «калі ласка», «будзьце ласкавы» і інш. Мясцовую газэту выпісваюць на расейскай мове. У характары гэтых супрацоўнікаў прывіўся такі звычай: калі хто зьвяртаецца пабеларуску, то яны даюць адказы таксама пабеларуску. Значыцца, усё ў парадку, ніхто ня можа да іх прычапіцца. Але калі глянуць далей, то і тут справа стаіць ня зусім добра. Вось, напрыклад, прыходзіць селянін ва ўстанову, зьвяртаецца да супрацоўніка. Яму адказы даюцца пабеларуску. Пасьля гэты самы супрацоўнік пры тым жа селяніне зьвяртаецца да другога супрацоўніка і ўжо на расейскай мове. Здаецца, усё добра. Селянін, як па закону паложана, атрымаў адказы на яго роднай мове. Але што думае ў гэты час селянін?

Тут патрэбна агаворачка.

Трэба сказаць, што старыя традыцыі, а іменна, погляд на беларускую мову, як мову мужыцкую, яшчэ жыве. Вось гэты самы селянін і думае: „бачыш ты іх, са мною дык памужыцку гутарыць, бо я мужык, адукацыі ня меў магчымасьці атрымаць, як яны, а паміж сабою панску, павучонаму“.

Такім чынам савецкі супрацоўнік у вачох гэтага селяніна робіцца чужым, далёкім. Селянін адчувае значную перавагу над сабою гэтага супрацоўніка. Яму прынамінаецца стары расейскі царскі чыноўнік, які калісьці нібы ласку рабіў мужыку, калі з ім гутарыў пабеларуску.

На XI-м партыйным зьезьдзе т. Кнорын, падводзячы вынікі і ставячы пытаньне аб заданьні партыі ў галіне нацпалітыкі, у сваім дакладзе кажа так: «Псабходна прывіць беларускую мову ў рабочае жыцьцё і быт. Агонь на ўсіх, хто не разумее, што гэтым у нашых умовах вырашаецца пытаньне аб узмацненьні саюзу рабочае клясы і сялянства».

Пастаўленае пытаньне тав. Кнорыным вельмі глыбокае і сур'ёзнае, але як жа падыйсьці да вырашэньня яго. Раней, чымся выказаць сваю падумку, хачу даць пару прыкладаў адваротнага значэньня, інакш кажучы, як робіць некаторыя беларусы, каб беларусізацыя не пранікла ў самы быт. Ёсьць шэраг таварышоў беларусаў, якія заўжды гавораць пабеларуску як на ўстанове, так і ў хаце, але толькі з тымі таварышамі, якія таксама заўжды гавораць пабеларуску. Калі-ж спаткаецца з таварышом, які хоць і ўладае беларускай мовай, але не дасканала, зьвяртаецца да апошняга парасейску. Больш таго, нават пры спатканьні з чалавекам добра ўладаючым беларускай мовай, але не «патэнтованым» беларусам, усё-ж такі вось гэты самы «патэнтованы» размаўляе парасейску. А што з гэтага выходзіць. Выходзіць тое, што чалавек, шчыра ўзяўшыся за вывучэньне беларускай мовы, патраціўшы грошы на настаўніка і літаратуру, уклаўшы шмат часу і энэргіі, вывучыўшы яе, ня мае практыкі штодзённага ўжытку гэтае мовы. Бачыце, «патэнтованыя» беларусы лічаць сваім абавязкам чамусьці зьвяртацца да яго не папабеларуску. Вы думаеце, што гэтыя «патэнтованыя» беларусы не зьвяртаюцца пабеларуску з якой-небудзь нагарды ці іншай прычыны? Не, гэта, бачыце, ёсьць так званая «далікатнасьць». Вось гэтае самае далікацтва я і лічу самай сур'ёзнай перашкодай прасоўванню беларусізацыі ў быт самых шырокіх працоўных мас.

Нас, беларусаў, гэтай «далікатнасьці» некалькі стагодзьдзяў вучылі пан з ксяндзом і расейскі чыноўнік з папом. Гэта старая шкодная традыцыя, што «на беларускай мове зварочваюцца да людзей адукаваных няпрыстойна“, —ёсьць нявольніцтва. Псыхалёгія нявольніцтва мае ў нас месца і па сёньнешні дзень. Яна прымусам навязана беларускаму рабочаму і селяніну пануючай клясай абшарнікаў і чыноўнікаў. Гэту ганебную прывычку, абражаючую беларускага рабочага і селяніна, які зараз сацыяльна і нацыянальна вызвален, трэба зьнічтожыць раз назаўсёды. Гэта шкодная прывычка шмат у каго нават з адпаведных працаўнікоў жыве падсьвядома, —трэба ад яе пазбавіцца якнайхутчэй. Ці-ж гэта ня прыкрае зьявішча, калі беларускія дзеячы, добра ўладаючы беларускай мовай, ужываючы яе ва ўстанове,—дома лічаць абавязкам з жонкай і дзецьмі гутарыць парасейску, хоць жонка і дзеці таксама ўмеюць гутарыць пабеларуску.

Альбо да падобнага таварыша прыяжджае селянін з глухога кутка Беларусі, яго добры знаёмы, і чуе, што гэты самы адказны працаўнік ва ўстанове з ім гутарыў пабеларуску, а вось у хаце парасейску. Сямейны быт, бачыце. Як-жа ва гэта паглядзяць тыя таварышы, якія вывучылі беларускую мову шчыра, сумленна, толькі ім практычна ўладаць ёю цяжка, калі «патэнтованыя» беларусы так ужываюць беларускую мову, калі «патэнтованыя» беларусы да вывучыўшых беларускую мову зьвяртаюцца парасейску. Мне асабіста вядомы выпадкі, калі да таварыша, які ведае беларускую мову і хоча навучыцца практычна ёю ўладаць, зьвяртаешся пабеларуску, і ён надзвычайна здаволен. Не дарма можна пачуць такія нараканьні: „Вы, беларусы, толькі паміж сабой гутарыце пабеларуску, а з намі ня хочаце. Калі-б з намі вы заўсёды гаварылі пабеларуску, мы куды хутчэй практычна ўладалі-б ёю, а разумець мы ўсё разумеем». Гэтыя нараканьні з боку тых таварышоў, якія імкнуцца вывучыць беларускую мову, якія шчыра праводзяць у жыцьцё ўсё дырэктывы і пастановы нашых партыйных і савецкіх органаў, зусім правідловы і заслугоўваюць вялікай увагі. Альбо вось гутарка па тэлефону. Пачнеш гаварыць пабеларуску—чуеш, адказваюць пабеларуску нават з такіх установаў, дзе, здавалася-б, і няма добра ўладаючых беларускай мовай, асабліва гэтых самых «патэнтованых» беларусаў. Вось падобныя прыклады і гавораць аб тым, як практычна праводзяць беларусізацыю ў самым быце.

Вывад адгэтуль такі. Хто добра ўладае беларускай мовай, той мусіць карыстацца ёю ўсюды, тым больш, што разумець яе ўсе разумеюць. Калі-ж часам прыдзецца мець справу з чалавекам, які запраўды не разумее пабеларуску, прыяжджы ён ці тутэйшы, то тут, бязумоўна, патрэбна тая самая «далікатнасьць». Але гэта «далікатнасьць» будзе зусім іншага гатунку, чымся тая, пра якую гаворылася вышэй.

П. Ільючонак.

Вясна ідзе.

Падрыхтоўка да вясеньняга севу.

СЁЛЕТА МЯРКУЕЦЦА ПЕРАВЕСЬЦІ НА ШМАТПОЛЬЛЕ 180 ТЫСЯЧ ГЭКТ. ПАХАТЫ, ПРЫЧЫМ ВЯСНОЙ МАЕ БЫЦЬ ПЕРАВЕЕЗЕНА ДА 110 ТЫСЯЧ ГЭКТ.—У БЯГУЧЫМ ГОДЗЕ НАМЕЧАНА АРГАНІЗАВАЦЬ 2-ХМЕСЯЧНЫЯ С.-Г. КУРСЫ ДЛЯ СЯЛЯНСТВА НА 750 ЧАЛАВЕК І 344 2-3-4-ХТЫДНЁВЫЯ КУРСЫ НА 15 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК.—БЕЛСЕЛЬБАНК ВЫДАЕ НА ПЕРАХОД НА ШМАТПОЛЬЛЕ, НА НАБЫЦЬЦЁ НАСЕНЬНЯ ЛЁНУ, КАНАПЛІ, ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР І ІНШ. 1385 ТЫСЯЧ РУБ.

Пасеўны плян павялічыцца.

Пасеўны плян БССР у 1926-27 г. займаў 3036619 гэкт., у 1927-28 г. пасеўны плян мае быць даведзен да 3.083.214 гэкт., што дае павялічэньне за 1 год на 1,5 проц. па паасобных культурах. Гэты плян разьмяркоўваецца наступным чынам: кармавыя травы—202.962 гэкт. (25,0 проц. росту), бульба—428.237 гэкт. (6,9 проц. росту), тэхнічныя культуры—165.244 гэкт. (10,5 проц. росту) і г. д.

Сельска-гаспадарчыя курсы.

Вялікая ўвага ў часе пасяўной кампаніі будзе зьвернута на аграпрапаганду. Па пляну вызначана арганізаваць для сялянства 25 сельска-гаспадарчых 2-хмесячных курсаў, якія маюць прапусьціць звыш 700 чалавек і 344 2-3-4-хтыднёвых курсаў, разьлічаных на 15 тысяч чалавек. Апроч таго, у сакавіку мяркуюць правесьці пры ўсіх РВК сэсіі с.-г. саветаў, на якіх будуць абмяркоўвацца пытаньні практычнага пераходу на шматпольле, разьмеркаваньня насеньня і інш.

Насеньне для вясеньняга севу.

Па пляну Наркамзему для вясеньняга севу патрабуецца: 541,5 тон канюшыны, 88,0 тон цімафейкі, 1230 тон вікі, 246,0 тон сэрадэлі, 1326 тон лубіну, 1050 тон ільнянага семя (даўгунец), 83,6 тон кораньплодаў, 2200 тон аўса і 448 тон ячменю. Прымаючы пад увагу няспрыяючыя для ўраджаю ярыны ўмовы леташняга году, Наркамзем прадугледжвае завезьці ў межы БССР 14.100 тон звычайнага аўса і 934 тон ячменю.

Мерапрыёмствы да палепшаньня гаспадаркі.

Па лініі Белсельбанку будуць выданы бядняцкім гаспадаркам і тым гаспадаркам, якія пераходзяць на шматпольле, наступныя крэдыты. На травасеяньне 865 тысяч руб., на пашырэньне пасеваў лёну і канаплі—170 тысяч руб., на збожжавыя культуры—200 тысяч руб. і на пашырэньне кораньплодаў—150 тысяч руб. Гадавы плян завозу штучнага ўгнаеньня намечан такі: 12300 тон супэрфасфату, 4110,5 тон тамасшлаку, 2714 тон касьцяной мукі, 2498,5 тон калійнай солі, 1443 тоны фосфарнай мукі, 198 тон азоцістага ўгнаеньня, 15 тон гіпсу, а ўсяго 23497 тон штучнага ўгнаеньня. На вясеньнюю слубу намечана завезьці: 5500 тон супэрфасфату, 630 тон калійнай солі і 600 тон тамасшлаку. На пабыцьцё штучнага ўгнаеньня для калектыўных аб'яднаньняў і бядняцкіх гаспадарак будуць выданы крэдыты на суму ў 550 т. руб.

Розных с.-г. машын: плугоў, барон спружынавых, абганялак, сеялак і інш. мае быць набыта на 8502251 руб., што дае павялічэньне ў параўнаньні з мінулым годам на 23,2 процанты.

Вясной будзе ачышчана 34082 тоны ярыны і пратраўлена ад сажы 4726 тон рознага збожжа.

Будзе пашырана далейшая арганізацыя паказальных вучасткаў. У бягучую паслуўную кампанію мае быць арганізавана 4156 паказальных вучасткаў, галоўным чынам, для дэманстрацыі разьвядзеньня кораньплодаў, лубіну і сэрадэлі ў тых райёнах, дзе гэтыя культуры слаба пашыраны, а таксама для дэманстрацыі карысьці ўжываньня штучнага ўгнаеньня.

У пасеўную кампанію будзе шырока ўжывацца кантрактацыя. Асноўнымі відамі кантрактацыі зьяўляюцца: сэрадэля, лубін, кораньплоды і канюшына; апроч таго, па лініі прамысловасьці будуць заключацца ўмовы на пасевы ячменю, лёну і бульбы. Сёлета намечана кантрактацыя на 98,5 тон канюшыны, на 54 тоны сэрадэлі і на 260 тон лубіну. Апроч таго, у калектыўных і бяднейшых сялянскіх гаспадарках будуць заключаны кантракты на разьвядзеньне сартавога насеньня на 4800 гэкт.

У гэту вясну намечана значная праца па адпаўленьні садоўніцтва і пашырэньні гароднiцтва. Паказальны дагляд будзе праведзен у 112 садох і 109 гародах. На барацьбу са шкоднікамі садоў сёлета асыгнавана: па дзяржаўным бюджэце 17.072 руб. і па мясцовым 15.962 руб.

З чым спаткае вясну Бабруйшчына.

Вясна ее загарамі. Хутка затурбуецца, заварушыцца пасьля зімовага перарыву селянін-земляроб у спорнай веснавой палявой працы. І вось—як мага лепей і карысьней арганізаваць гэтую веснавую сялянскую працу, стаіць адной з галоўных задач нашых акруговых органаў.

Веснавую пасяўную кампанію трэба правесьці арганізована і так, каб кожны год даваў новыя, карысныя зьявы ў агульным становішчы сельскай гаспадаркі акругі і ў справе яе якаснага палепшаньня. Вось пагэтаму ўжо даўно распрацован плян правядзеньня вясновай пасяўной кампаніі на акрузе.

Плян ставіць сабе ў якасьці першай мэты некаторае павялічэньне пасяўной плошчы супроць 1927 году. Павялічэньне гэта па яравому кліну будзе дасягаць 7,3 процанта.

Насеньне і ўгнаеньне.

Насеньнем збожжавых культур вёска акругі забясьпечана на ўсе сто процантаў і ў гэтай галіне патрабуецца толькі завоз аўсу і лену-даўгунцу. Што-ж датычыцца траў, дык гэтае насеньне будзе завезена ў акругу ў значнай колькасьці. Здавальненьне сялянства насеньнем траў усклад ецца на аддзяленьні Цэнтраземскладу і казапэрацыю.

У водпуску сялянству насеньня будзе адыгрываць вялікую ролю крэдыт. Акрсельбанк на правядзеньне пасяўной кампаніі мяркуе адпусьціць сто тысяч рублёў крэдытаў, пры чым галоўныя крэдыты маюць па мэце спрыяньне пашырэньню травасеяньня.

Штучнага ўгнаеньня будзе загатоўлена да веснавой пасяўной кампаніі да 700 тон. На гэтую мэту банкам будзе адпушчын крэдыт у 15 тысяч рублёў і ўгнаеньне будзе адпушчацца сялянству ў крэдыт.

Машыны і крэдыты сялянству.

Распрацован плян здавальненьня вёскі сельска-гаспадарчымі машынамі і прыладамі. На гэтаму пляну будзе загатоўлена к вясьне 5260 плугоў, 740 акучнікаў, 255 барон простых і 552 спружынаўкі і г. д. Усе машыны і прылады будуць адпушчацца сялянству на вельмі ільготных умовах у крэдыт на некалькі год. З мэтай прасоўваньня ў вёску радавой сеялкі яны будуць адпушчацца ў крэдыт нават без задатку. Крэдыт на гэтую мэту вызначаецца ў 53 тысячы рублёў.

Усяго на фінансаваньне сельскай гаспадаркі (асноўны капітал) будзе выдадзена 328 тысяч рублёў крэдыту, на асобныя галіны с.-гаспадаркі—185 тысяч, на с.-г. прамысловасьць—15 тысяч, на калектыўнае гаспадараваньне—20 тысяч, у фонд беднаты 65 тысяч і г д., а агулам 774 тысячы.

Барацьба за якасьць хлеба.

Гэта—адна з чарговых задач нашай сельскай гаспадаркі. Салекцыйнае, ачышчанае, адборнае, добрагатунковае і пратраўленае насеньне павінна заняць пачэснае мейсца ў нашым паляводзтве. Вось пагэтаму ўвесь гатунковы насеньны матар'ял на акрузе строга падлічан. Ён будзе абменен на сялянскае насеньне. Пастаўлена сур'ёзна справа в зерноачышчэньнем, зьвернута ўвага на пашырэньне дзейнасьці насеннаводных таварыстваў.

Ачыстка і пратраўліваньне насеньня.

Ужо цяпер 228 машын накіравана ў вёску на зерноачышчэньне. Імі за зерноачыстны сэзон будзе ачышчана 510 тысяч пудоў насеньня або 27,3 проц. усяго пасяўнога матар'ялу. Пратраўліваньне будзе праведзена ў адносінах тых культур збожжа, якія болей заражоны галаўнёю. Так, напрыклад, проса мяркуецца пратравіць амаль што поўнасьцю (92,5 проц.).

Агрыкультурная прапаганда.

Гэтая прапаганда вясною будзе праводзіцца праз закладку розных паказацельных вучасткаў па сялянскіх палёх. Усяго мяркуецца закласьці да 700 вучасткаў. Вучасткі будуць закладацца пад кіраўніцтвам агранамаў і яны-ж будуць сачыць за вынікамі закладкі.

Шмат яшчэ іншых карысных мерапрыёмстваў сельска-гаспадарчага характару будзе праведзена ў веснавую пасяўную кампанію.

Вясна ідзе... Да яе шпарка рыхтуецца вёска і сельска-гаспадарчыя працаўнікі акругі. І як-бы яна хутка ні прышла, яна не застане вёску непадрыхтаванай.

А. Дамброўскі.

Як працуе агранамія.

Гэтым летам было падпалена гумно РВК, дзе знаходзіўся зерноачышчальны абоз. У сучасны момант стаіць задача перад РВК аднавіць гэты абоз.

Райён абслугоўвае адзін аграном і два памоцнікі.

Райён разьбіт на 4 падрайёны. Да кожнага падрайёну прымацован аграном, адзін Палескі падрайён, такім чынам, застанецца без агранома, што ўносіць пэўныя перашкоды ў працу агранаміі.

Раней па райёну было 13 с-г. машын, якімі магчыма было за мінулы час ачысьціць 18059 пудоў насеньня.

Пратраўлена ў вясеньнюю пасяўную кампанью 5000 пудоў рознага збожжа.

За мінулы год на шпатпольле пераведзена 610 гэкт. зямлі або 164 гаспадаркі, а ўсяго па райёну пераведзена на шматпольле 1664 гэкт. або 355 гаспадарак.

Значна вырасла зацікаўленасьць сялян да агранамічных ведаў і ў сувязі з гэтым у трох вёсках праводзіліся двухтыднёвыя курсы пад кіраўніцтвам агранамаў, якія праслухалі 85 сялян. Прачытана на вёсках 84 лекцыі на сельскай гаспадарцы. Працуюць па райёну 23 с-г. гурткі, якія налічваюць 356 чалавек.

М. Козік.

Любаньскі р., Бабруйшчына.

ПАЗЫКА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СЯЛЯНСКАЕ ГАСПАДАРКІ.

Як праходзіць рэалізацыя пазыкі

(Па тэлефону ад уласных карэспандэнтаў).

Барысаў, 10-2. Рэалізацыя пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі фактычна распачалася ў Барысаўскім райёне толькі з 1-га лютага. За час да 8-га лютага па райёну прададзена аблігацый пазыкі на 2025 руб. 50 кап.

Койданава, 10-2. Водлуг даных, да 8-га лютага ў нашым райёне рэалізавана сялянскай пазыкі ўсяго на 545 руб., з якіх 425 руб. прыпадае на тэрмін да 1-га лютага. Адгэтуль відаць, што мясцовыя арганізацыі ў сваёй працы не адводзяць належнай увагі пытаньню рэалізацыі пазыкі. Трэба прачнуцца.

Астрашыцкі-Гарадок, 10-2. За час да 1-га лютага па райёну было рэалізавана аблігацый сялянскай пазыкі на 1727 руб. 50 кап., а з 1-га да 8-га лютага—на 1700 руб. Пры гэткім тэмпе рэалізацыі далёка не даедзем. Неабходна мясцовым арганізацыям больш зьвярнуць увагі на справу рэалізацыі пазыкі.

Плешчаніцы, 10-2. Калі з пачатку кампаніі да 1-га лютага было па райёну прададзена аблігацый сялянскай пазыкі на 1367 руб. 50 кап., дык за восем дзён студзеня—усяго толькі на 162 руб. 50 кап. Райвыканкому неабходна падцягнуць контрагентаў, якія ўзяліся за рэалізацыю пазыкі, бо, відаць, апошнія чакаюць пакуль да іх прыдзе селянін, а самі да яго ня ідуць.

Пухавічы, 10-2. З пачатку кампаніі па Пухавіцкаму райёну рэалізавана аблігацый сялянскай пазыкі на досыць буйную суму—11310 руб.; але, калі паглядзець, як разгортваецца кампанія, дык прыдзецца сказаць, што за апошні тыдзень тэмп значна зьнізіўся. Так, да 1-га лютага было рэалізавана аблігацый на 10345 руб., а рэшта прыпадае на люты (да 8-га).

Самахвалавічы, 10-2. Кампанія па рэалізацыі сялянскай пазыкі ў нашым райёне распачалася толькі з 1-га лютага і да 8-га лютага прададзена аблігацый на 4000 руб. Маецца надзея, што заданьне будзе выканана поўнасьцю.

Смалявічы, 10-2. З пачатку кампаніі да 1-га лютага ў Смалявіцкім райёне прададзена аблігацый новай сялянскай пазыкі на 3000 руб., а за восем дзён лютага кампанія пашырылася, і ўжо прададзена на 4692 руб. Такім чынам, па нашаму райёну рэалізавана сялянскай пазыкі на 7692 руб. Калі справа рэалізацыі пойдзе так і далей, дык зададзена будзе выканана на ўсе 100 процантаў.

Асьветнікі падпісаліся на 800 руб.

4-га лютага адбылася канфэрэнцыя працаўнікоў асьветы Смалявіцкага райёну. На канфэрэнцыі, між іншымі пытаньнямі, уважліва абгаворана пытаньне пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі.

Канфэрэнцыя аднагодна адзначыла правільнасьць і своячасовасьць выпуску дзяржавай сялянскае пазыкі, якая дапаможа ў сацыялістычным будаўніцтве нашае краіны.

Працаўнікі асьветы ўзялі на сябе абавязак правесьці шырокую кампанію па распаўсюджваньні пазыкі сярод сялянства райёну. Самі настаўнікі зрабілі пачын—раскупілі на канфэрэнцыі аблігацый пазыкі больш як на 800 рублёў. Вясковы настаўнік т. Нікановіч падпісаўся на пазыку на 5 руб. і выклікае т.т. Курневіча, Чарэя, Гурыновіча, Купрэвіча і Мажэйку.

Добры прыклад паказалі смалявіцкія асьветнікі.

М.

Новаму пакаленьню—новую гаспадарку

Ворша, 8-II. (Ад ул. кар.). 31-га студзеня на сходзе рабочых і служачых сав. гаспадаркі Забалоцьце было пастаўлена пытаньне аб пазыцы ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі.

Сход аднадушна пастанавіў падпісацца на пазыку ўсім прысутным хто на колькі можа.

Праз некалькі хвілін каля стала сабралася цэлая куча людзей, кожны з іх стараўся падпісацца першым. Белы аркуш паперы хутка стаў рабым. Падпісалася 47 таварышоў на 197 руб. 50 кап. Апрача гэтага, сав.-гаспадарка падпісалася асобна на 100 руб.

Прыходзілі нават старыя дзяды, якія маюць па 60—70 год, і з вялікай ахвотай падпісаліся на 5-цірублёвыя аблігацыі, кажучы: «Новаму пакаленьню неабходна наладзіць новую лепшую гаспадарку".

Бярэце прыклад.

Магілеў, 10-II. (Ад ул. кар.). У вёсцы Шапчыцы, Магілеўскай акругі, усе 70 двароў набылі аблігацыі пазыкі, на суму 300 руб. Рэалізацыя прайшла пры актыўнай дапамозе настаўніцы т. Алейнікавай.

Рабочыя не адстаюць.

Ворша, 10-II. (Ад ул. кар.). Рабочыя заводу «Чырвоны Кастрычнік» за першыя 3 дні кампаніі падпісаліся на 2000 руб. Падпіска ахапіла 90 проц. усіх рабочых.

Рабочыя і служачыя савецкай гаспадаркі Забалоцьце падпісаліся на сялянскую пазыку на 197 руб. 50 к. Усяго падпісалася 47 чалавек.

Сьвядомыя рабочыя.

(Плем. гаспадарка „Русінавічы“, Самахвалав. райёну).

Рабочыя племянной гаспадаркі «Русінавічы», Самахвалавіцкага райёну, купілі аблігацый пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі на 480 руб. Падпіска на пазыку сярод рабочых гаспадаркі прадаўжаецца.

Да 2-II—раскупілі аблігацый на 4000 руб.

(Самахвалавіцкі райён).

Пры РВК ўтворана тройка, якая кіруе распаўсюджваньнем пазыкі ў райёне. Да 2-га лютага ў райёне раскуплена аблігацый на 4000 руб.,—але ў некаторых с.-саветах рэалізацыя пазыкі праходзіць слаба. Ёсьць, аднак, надзея, што вызначаная на райён колькасьць аблігацый пазыкі будзе рэалізавана поўнасьцю.

Беднякі ідуць наперадзе.

Ворша, 9-II. (Ад ул. кар.). У в. в. Ваўкавіцы і Чорная Сасна, Забалоцкага сельсавету, першымі падпісаліся на пазыку беднякі і бядняцкі-ўдовы. У гэтых вёсках куплена пазыкі на 55 р. Наогул відаць, што зацікаўлена пазыкай бядняцкая частка вёскі.

Што чакае Паўночную Амэрыку?

ПАЎНОЧНА-АМЭРЫКАНСКІЯ ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ УВАЙШЛІ У ПЭРЫЯД ЦЯЖКАГА ГАСПАДАРЧАГА КРЫЗІСУ.—БАРАЦЬБА ЗА РЫНКІ ЗБЫТУ У ПАУДНЁВАЙ АМЭРЫЦЫ. ПАУНОЧНАЯ АМЭРЫКА УЗБРОЙВАЕЦЦА, РЫХТУЮЧЫСЯ ДА СХВАТКІ СА СВАІМ КАНКУРЭНТАМ—АНГЛІЯЙ.

Вера ў Амэрыку—залог далейшых посьпехаў і дабрабыту.

У працягу апошніх 6 гадоў Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты перажывалі пэрыяд нясупыннага росквіту амэрыканскага капіталізму.

Апошнія 6 гадоў былі гадамі аграмадных прыбыткаў для амэрыканскіх капіталістаў, былі гадамі нячуванага ўздыму гаспадаркі, і таму шмат каму здавалася дзіўным гаварыць пра магчымасьць якога-б там ні было крызісу, або, прынамсі, гаспадарчага паслабленьня Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў.

Ня так даўно—у кастрычніку 1927 году—прэзыдэнт Злучаных Штатаў Кулідж у сваі пасланьні сэнату пісаў:

«Мы з радасьцю заяўляем, што агульнае становішча дзяржавы ў працягу 4-х апошніх гадоў было добрае. Мы карыстаем мір, наша краіна мае посьпехі, якіх ня мела да гэтага часу ніводная дзяржава. Стаўкі заработнай платы ўзьняліся да найвялікшых разьмераў, магчымасьць заработку вельмі багатая; некаторыя галіны сельскай гаспадаркі і прамысловасьці адсталі, некаторыя мясцовасьці пацярпелі ад гуратанаў і паводкаў, але гэтыя страты былі пераможаны без значнай шкоды для ўсяго нашага эканамічнага становішча. Калі народ захавае веру ў сябе, на якую мае поўнае права, калі кожны захавае веру ў другога, а ўсе захаваюць веру ў Амэрыку, дык гэтыя посьпехі і дабрабыт .залатуць у яго і надалей".

Можна, разумеецца, верыць і ў сябе, і ў Амэрыку, і ў самога Кулідж колькі ўгодна, але вер ці ня вер, а пачатак эканамічнага крызісу ёсьць факт рэальны.

Вер ці ня вер, а аграмадны рост узброеньня, падрыхтоўка да новай вайны—таксама факт зусім рэальны.

А пры такім становішчы, калі вынікае пагроза вайны, колькі-б прэзыдэнт Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў ні заклікаў «верыць», цяжка верыць у «посьпехі» і дабрабыт працоўных Паўночнай Амэрыкі.

Апошнія месяцы паказалі, што ў разьвіцьці амэрыканскай гаспадаркі надышоў поўны пералом у благі бок.

Нясупынны гаспадарчы рост пачаў паступова зьмяняцца заняпадам, скарочаньнем у паасобных галінах гаспадаркі, вызначылася агульнае паслабленьне ўсёй гаспадаркі Злучаных Штатаў у цалку.

І характэрна, што той самы прэзыдэнт Кулідж, які ў кастрычніку ў такіх ружовых фарбах размалёўваў пэрспэктывы «посьпехаў» амэрыканскай гаспадаркі, напярэдадні новага году на запытаньне прадстаўнікоў друку, **што чакае Амэрыку ў надыходзячым 1928 годзе,**—адмовіўся сказаць што колечы наконт пэрспэктываў гаспадарчага разьвіцьця Паўночнай Амэрыкі.

Першыя адзнакі эканамічнага крызісу.

Што-ж здарылася, што змусіла Куліджа быць такім стрыманым у ацэнцы пэрспэктываў эканамічнага становішча Амэрыкі?

Перш за ўсё, за апошніх 6 месяцаў у Амэрыцы **скарацілася агульная колькасьць прадукцыі.** У прыватнасьці выраб найбольш важнага і найбольш паказацельнага прадукту—сталі—паў за апошніх 6 месяцаў на 2 процанты.

Нясупынна расьце беспрацоўе, сярэдні тыднёвы заработак рабочых на прадпрыёмствах зьнізіўся, колькасьць беспрацоўных у параўнаньні з мінулым годам узрасла на 5 процантаў, здабыча высокакаснага вугля зьнізілася на 15 процантаў, прыбыткі ад чыгуначнага транспарту скарацілісь больш чым на 10 проц., зьменшылася перавозкі і нагрузкі на чыгуначным транспарце.

Тое-ж самае робіцца і ў галіне сельскай гаспадаркі.

Да немагчымага дайшло становішча ў вугольнай прамысловасьці, **дзе вось ужо дзесяты месяц 150.000 вуглякопаў вядуць гарачую барацьбу са сваімі гаспадарамі-міліярдэрамі.**

Вось як апісвае становішча гэтых гарнякоў буржуазная газэта «Нью-Лідэр» у нумары за 17 сьнежня 1927 году:

„Пры марозе да 20 градусаў,—чытаем мы ў лісьце з аднаго рабочага пасёлку недалёка ад Пітэбурга,—сотні вуглякопаў разам з іхнімі сем'ямі ходзяць босымі, апранутымі ў рызьзё. Сабраныя ахвяраваньні былі страчаны на вугаль дзеля апалу старых баракаў і сутараньняў, у якіх гібеюць вуглякопы пасьля таго, як іх павыкідалі з дамоў, належачых вугольным кампаніям. Ні вуглякопы, ні мясцовыя прафсаюзныя арганізацыі ня маюць сродкаў, каб заплаціць за кватэры гарнякоў. Пастаўнікі мясцовых школ апавядаюць, што дзеці млеюць у школах з голаду; сотні дзяцей застаюцца дома, ня маючы чаго абуць і апрануць».

Дык во пры якіх абставінах прыходзіцца змагацца за свае правы амэрыканскім гарнякам.

Такі выгляд у запраўднасьці маюць разважаньні Куліджа пра посьпехі і дабрабыт амэрыканскага народу.

Аўтамабільная вайна.

Найбольш цяжкія пэрспэктывы вызначаюцца ў аўтамабільнай прамысловасьці. Як вядома, аўтамабільным каралём да гэтага часу ў Амэрыцы лічыўся **Гэнры Форд.** Прыблізна год таму назад Форд сайшоў са сцэны, амаль што спыніў выпуск аўтамабіляў і цэлы год біўся над вынаходкай новай мадэлі аўтамабіля, каб з большым посьпехам канкурыраваць і змагацца з другімі аўтамабільнымі фірмамі і асабліва з галавой аўтамабільнага трэсту **Морганам.**

Форд змушан быў гэта зрабіць, галоўным чынам, таму, што стала вельмі цяжка прасоўваць аўтамабілі, якія выкідываліся фордаўскімі заводамі, як бліны з добрай печы.

У выніку гэтых «шуканьняў» Форда выраб аўтамабіляў у 1927 годзе скараціўся на 21 проц.

Зараз Форд закончыў свае шуканьні і выступіў з новымі, палепшанымі мадэлямі аўтамабіля.

Як толькі сталі вядомымі вынікі фордаўскай вынаходкі, сярод іншых аўтамабільных фірмаў пачалася шалёная гарачка па ўдасканаленьню і патаненьню аўтамабільнага будаўніцтва.

Прадстаіць сярдзітая аўтамабільная вайна паміж некалькіх аўтамабільных каралёў. Але меркаваць, што ў выніку палепшаньня і патаненьня аўтамабільнага вырабу можна пашырыць рынкі збыту ўнутры Паўночнай Амэрыкі, вельмі цяжка, бо, папершае—сама Амэрыка насычана аўтамабілямі да крайнасьці, а падругое—вядома, што раз ёсьць паслабленьне гаспадарчага становішча, дык нямінуча слабее пакупацельная здольнасьць амэрыканскага жыхарства.

Раз расьце беспрацоўе, горшае становішча сельскай гаспадаркі, дык гэтым самым скарачаюцца рынкі збыту ўнутры самой Амэрыкі. Спадзяванца-ж на вялікі вываз аўтамабіляў за акіян надта няжка, бо і ў Нямеччыне, і ў Італіі, і ў Францыі гэта галіна прамысловасьці значна разьвілася, і гэтыя дзяржавы, разумеецца, прымуць меры да таго, каб пры дапамозе высокіх мытных збораў і іншых перашкодаў не дапусьціць амэрыканскіх аўтамабіляў у Эўропу.

Перад паўным крызісам стаіць таксама і **будаўнічая прамысловасьць.**

Цяжка, разумеецца, зараз казаць пра тое, як хутка пойдзе ўперад эканамічны крызіс Амэрыкі. Але зусім ясна, што адзіным выхадам, які зможа крыху затрымаць хуткі развой гаспадарчага крызісу Паўночнай Амэрыкі, будзе пашырэньне рынкаў збыту амэрыканскай прамысловасьці па-за межамі саміх Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў.

Барацьба за паўднёва амэрыканскія рынкі збыту

даляраў. Апрача гэтага, трэба ўтварыць які-колечы „надзвычайны“ бюджэт дзеля падрыхтоўкі да будучай вайны.

Прыблізна такая ж самая падрыхтоўка ідзе па лініі паветраных і газавых узброеньня.

Дзеля чаго ўсё гэта робіцца?

Марскі міністр Вільбур надзвычайна шчыра выказаўся наконт гэткага ўздыму ўзброеньня.

«Нашы купцы і фабрыканты,—сказаў Вільбур,—павінны мець магчымасьць утрымліваць чужаземныя рынкі, на якіх мы замацаваліся, а па меры таго, як у Эўропе аднаўляецца нармальнае становішча, мы павінны шукаць і новыя рынкі для нашай прадукцыі».

Ясна і зразумела. **Замацоўваць старыя рынкі і «шукаць» новыя**—вось задача тых новых крэйсэраў, аэраплянаў і г. д., якія будуць пабудаваны ў бліжэйшым часе ў Паўночнай Амэрыцы. А начальнік нью-ёркскага парта адмірал Плэнкет дык проста заявіў, што **Паўночная Амэрыка знаходзіцца на шляху ваеннай сутычкі з Англіяй** (гэты самы адмірал Плэнкет зараз зволен са службы за сваю лішнюю балтлівасьць).

Гаспадарчыя нелады Злучаных Штатаў нямінуча прывядуць (і ўжо прыводзяць) да няпрыязных адносінаў паміж Паўночнай Ам

САВЕЦКАЯ УЛАДА ДАПАМАГАЕ СЕМ'ЯМ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ.

ДА 10 ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ДАСЯГНЕНЬНІ І НЕДАХОПЫ Ў СПРАВЕ ВЫКАНАНЬНЯ КОДЭКСУ ЗАКОНАЎ АБ ІЛЬГОТАХ СЕМ'ЯМ ВАЙСКОВА-СЛУЖАЧЫХ.

САВЕЦКАЯ КРАІНА ПАВІННА ВЕДАЦЬ СВАІХ ГЭРОЯЎ.

Г. К. Жукаў.

Сын батрака. У старой арміі служыў з 1915 году.

Удзельнік грамадзянскай вайны з 1918 году.

Тав. Г. Жукаў пабываў на франтох пад Уральскам, пад Царыцынам, прымаў удзел у баёх супроць дэсанту Урангеля, ваяваў на паўночным Каўказе і інш.

Апроч таго, ён прымаў чынны ўдзел у ліквідацыі бандаў Антонава, Калесьнікава і Зьверава.

Ордэнам Чырвонага Сьцягу нагароджан за тое, што ў баю пад Вязавой-Почтай, маючы задачу ўтрымаць важны стратэгічны напрамак, быў 6 раз атакаваны ворагам, сілы якога ў шмат разоў перавышалі сілы тав. Жукава, аднак, свае пазіцыі ён ня ўступіў.

Урэшце, адважнаю контр-атакаю дамчэнту разьбіў часьці ворага і забраў назад частку артылерыі, якая перад гэтым папала ў палон ворагу. Пры гэтым, было зьнішчана некалькі сот белагвардзейцаў.

Тав. Н. Мартынаў.

Нарадзіўся ў 1896 годзе ў сям'і чыгуначнага машыніста. Да 1915 году працаваў сьлесарам у арсэнале.

У 1917 годзе паступіў у Чырвоную гвардыю і прымаў актыўны ўдзел у наступных баёх:

у 1917 годзе ў Маскве тав. Мартынаў дапамагаў скінуць уладу Керанскага; у 1918 годзе на бранявых машынах удзельнічаў у баёх супроць чэхаславакаў; у 1919 годзе тав. Мартынаў прыняў камандаваньне бранявым атраданам і выступіў з ім у бой супроць войск генэрала Дутава пад гор. Уральскам. За ўзяцьце гэтага гораду тав. Мартынаў нагароджан ордэнам Чырвонага Сьцягу.

У 1920 годзе на бранявых машынах тав. Мартынаў прыняў актыўны ўдзел у ліквідацыі бандаў генэрала Урангеля, браў Перакоп, за што і атрымаў другі ордэн Чырвонага Сьцягу.

Камандуючы аўта-бранявым дывізёнам, у 1921-22-23-24 гадох ваяваў супроць белагвардзейцаў у Сібіры і супроць басмачоў у Туркестане.

Ільготы сем'ям чырвонаармейцаў узмацняюць іх гаспадарку.

(Па матар'ялах абсьледаваньня РСІ).

Згодна пастановы Прэзыдыуму ЦВК БССР ад 10 лютага 1927 г. РСІ праведзена праверка выкананьня законаў аб ільготах вайскова-служачым і іх сем'ям на Менскай акрузе за 1925-26 год.

Гэта абсьледаваньне мела на мэце выявіць умовы і парадак правядзеньня ў жыцьцё ільгот для сямей вайскова-служачых і звольненых з РСЧА і Флёту. Выявіць рэальнае значэньне ільгот, якія даюцца вайскова-служачым і іх сем'ям. Выявіць недахопы сучаснага кодэксу і прычыны, якія перашкаджаюць прадстаўленьню ільгот. Што-ж выявіла гэта абсьледаваньне? Гэта праверка дала магчымасьць РСІ зрабіць наступныя вывады:

НІЯКАГА КАНТРОЛЮ ЗА ВЫКАНАНЬНЕМ ЗАКОНУ НЯ БЫЛО.

Ільготы і дапамога вайсковым служачым і іх сем'ям даваліся рознымі органамі і ўстановамі на мясцох пры правядзеньні імі тых, альбо іншых законаў. Але кіраўніцтва і нагляду за правядзеньнем у жыцьцё кодэксу аб ільготах ня было даручана пэўнаму органу. Кіраўнічых указаньняў з боку вышэйшых установаў было досыць, але на мясцох мала хто цікавіўся тым, як ажыцьцяўляецца кодэкс на справе. Ніякага кантролю за выкананьнем закону аб ільготах устаноўлена ня было. Гэтым тлумачацца даволі сур'ёзныя недахопы, якія мелі месца ў некаторых райёнах пры прадстаўленьні ільгот. Райвыканкомы і сельсаветы не наладзілі належнага вучоту: 1) сямей вайскова служачых, 2) іх маемаснага становішча і ў якой меры яны адчуваюць патрэбу ў дзяржаўнай дапамозе і 3) ня было вучоту прадстаўленых ім ільгот.

НАСЕЛЬНІЦТВА НЯ ВЕДАЕ АБ ІЛЬГОТАХ ДЛЯ С.-ГАСП.

У шмат якіх мясцох заўсім ня было ніякага вучоту. Толькі ў сувязі з запатрабаваньнем Арг'аддзелу ЦВК справаздачнасьці ад АВК па гэтаму пытаньню і абсьледаваньнем НК РСІ, мясцовыя органы прынялі меры, каб наладзіць гэты вучот. Дзейнасьць мясцовых органаў па аказаньню дапамогі праводзілася бяз пляну і ў большасьці выпадкаў дапамагалі сем'ям, якія зварачваліся са сваёй заявай ў тую, альбо іншую ўстанову. Слаба праводзілася праца па растлумачэньню насельніцтву значэньня кодэксу законаў. Насельніцтва ведае толькі аб найбольш важных ільготах для сельскай гаспадаркі і то не аб усіх.

НЯ ЎСЕ СЕМ'І ЧЫР-ЦАЎ КАРЫСТАЮЦЦА ІЛЬГОТАМІ.

Гэта абсьледаваньне выявіла, што нізавыя савецкія органы ня досыць знаёмы з заканадаўствам, некаторыя райвыканкомы ня ведалі пра існаваньне кодэксу. Абсьледаваньне таксама выявіла, што па некаторых райёнах ня ўсе сем'і чырвонаармейцаў карыстаюцца ільготамі. Звычайна ільготы даюцца тым сем'ям, якія маюць пасьведчаньне ад вайсковай часьці, у якой служыць член дапай сям'і. Але гэтыя пасьведчаньні ня кожная сям'я чырвонаармейца мае, бо часта яны адбіраюцца мясцовымі органамі пры прадстаўленьні адной якой-небудзь ільготы. З гэтай прычыны ня ўсе хадайніцтвы здавальняюцца. Найбольш поўна сем'і вайскова-служачых выкарыстоўваюць ільготы: паштовыя, па палатках і зборах, страхаваньні, па сельска-гаспадарчаму падатку, водпуску лесу ільготнага і дармовага, землеўпарадкаваньню і мэдыцынскай дапамозе ў гарадох. У некаторых райёнах саўсім ня ўжываюцца ільготы па выдачы пазык і крэдыту, водпуску с-г інвэнтару і інш.

У сваёй справаздачы Менскі АВК піша: «Пляну па прадстаўленьню ільгот ня было, ільготы даваліся ў працэсе правядзеньня таго ці іншага мерапрыёмства (с-г. падатак, землеўпарадкаваньне, разьмеркаваньне лесу і г. д.), сяляне падавалі заявы аб ільготах, галоўным чынам, па с-г. падатку і ў назначнай колькасьці па іншых відах». Такім чынам, большасьць ільгот зусім ня ўжываецца альбо ўжываецца ў нязначнай ступені і зусім выпадкова.

ЗАЯВЫ АБ ІЛЬГОТАХ ПА С.-Г. ПАДАТКУ ЗДАВОЛЕНЫ НА 100 ПРОЦАНТАЎ.

Але ў большасьці райёнаў Менскай акругі найбольш бедныя сялянскія гаспадаркі атрымоўваюць меншую скідку па с.-г. падатку і, наадварот, большая сума прыпадае на гаспадаркі, якія маюць большы прыбытак. Аб гэтым сьведчаць наступныя лічбы: па Вузьдзенскаму райёну на 100 проц. звольнена 3 гаспадаркі; сума скідкі 10 р., што ў сярэднім складае 3 р. на адну гаспадарку. На 75 проц. звольнена 88 гаспадарак, сума скідкі 693 руб., у сярэднім 7 р. на гаспадарку. На 50 проц. звольнена 3 гаспадаркі, сума скідкі 36 р., у сярэднім 12 р. на гаспадарку. На 25 проц. звольнена 22 гаспадаркі на суму 344 р., што ў сярэднім складае 15 р. 50 к. на адну гаспадарку. Па ўсёй Менскай акрузе на 100 проц. звольнена 20 гаспадарак, сума скідкі 243 р. у сярэднім 12 руб. на адну гаспадарку; на 75 проц. 648 гаспадарак на суму 5415 р. у сярэднім 8 р. на гаспадарку; на 50 проц. 81 гаспадарка на 773 р. у сярэднім 9 р. 50 к., на 25 проц. 462 гаспадаркі на суму 5179 р., у сярэднім 11 р. **Усяго 1211 гаспадарак на суму 11611 р., што ў сярэднім складае 9 р. 50 к. на гаспадарку.**

ПЭНСІІ МАЛАМОЦНЫМ СЕМ'ЯМ.

Многія райвыканкомы аказваюць значную дапамогу маламоцным сем'ям чырвонаармейцаў. Гэта дапамога праводзіцца рэгулярна, штомесячна з мясцовых сродкаў і ўключана ў выдатковую частку райённага бюджэту. Так, па 3 райёнах Менскай акругі ў 1925-26 г. выдадзена 17 сем'ям 638 руб. Камітэты сялянскай узаемадапамогі аказваюць дапамогу сем'ям вайсковаслужачых у розных мясцох па рознаму, у залежнасьці ад сродкаў.

Усе ільготы і перавагі сем'ям чырвонаармейцаў аказваюць значнае падтрыманьне гаспадаркам, але ня ўсюды аднолькава робяць уплыў на разьвіцьцё іх.

На аснове сваіх вываду РСІ прапанавала адпаведным установам правесьці шэраг мерапрыёмстваў, ажыцьцяўленьне якіх значна палепшыць працу на мясцох па аказаньню дапамогі і ільгот сем'ям чырвонаармейцаў.

Загатоўкі хлеба і сыравіны.

У Глускім спаж. т-ве няма шкла, а ў Быхаве на базе яго ляжаць вялікія запасы.

КААПЭРАТАРЫ КОЛЧАЎСКАГА І БАШНІЦКАГА КААПЭРАТЫВАЎ НЕ ДАЗВАЛЯЮЦЬ ПРАЦАВАЦЬ КАРАБЕЙНІКАМ УПРАВЫ ДЗЯРЖГАНДЛЮ.

Не загатоўкі, а недарэчнасьць.

(З нарады Нар. Кам. Гандлю).

На нарадзе працаўнікоў Нар. Кам. Гандлю 9 лютага ў цэнтры ўвагі была справаздача магілеўскага акр. інсп. гандлю аб ходзе загатовак.

У Магілеўшчыне справа загатовак горш, чым у іншых акругах.

Прадстаўніку Магілеўшчыны нечым было пахваліцца на нарадзе, бо лічбы гавораць самі за сябе. К прыкладу, летась у Магілеўшчыне і далучанай частцы Калініншчыны было загатоўлена ільнянага сена 250.000 пуд., а зараз усяго 90.000 п.; квартальны плян па лесазагатоўках выкананы ўсяго толькі на 10 пр. Ня лепшы малюнак і з іншымі прадуктамі сельскай гаспадаркі. Рацей магілеўцы скардзіліся, што прыватнік перашкаджаў загатоўкам, але калі апошні з рынку зышоў, дык усё роўна справа не палепшылася.

З плянамі кепска.

Узмоцненая загатоўчая кампанія распачалася з першых дзён студзеня, а нізоўка ў канцы студзеня ўсё яшчэ ня мела заданьняў ад сваіх акруговых цэнтраў. На лютым-ц плян складзены толькі 5-га акр. інсп. гандлю, а пакуль ён дойдзе з акрсаюзаў да нізоўкі, дык папэўна пройдзе палова лютага.

Ня лепш справа і з вучотам.

Пытаньне вучоту загатовак пастаўлена ў Магілеве слаба. Тлумачыцца гэта тым, што шэраг нізавых загатоўцаў ня маюць сваіх цэнтраў у акрузе. Так, спажывецкай каапэрацыяй кіруе «Днепрасаюз», а апошні не дае амаль што ніякіх звестак аб загатоўках. У Магілёве ёсьць 7 пунктаў скурсындыкату; яны даюць справаздачы непасрэдна ў Менск. Такі-ж малюнак і з пунктамі Ўправы Белдзяржгандлю.

Прамтавары ёсьць, але ляжаць на складах.

Глускае спажывецкае таварыства скардзіцца, што няма законнага шкла, а на базе ў Быхаве ляжыць яго, колькі хочаш.

— Ці пакараны гэтыя працаўнікі?— пытаюцца ў таварыша з Магілева.

— Я наводзіў справукі, гавораць, што шкло ёсьць,—адказвае той флегматычна.

Адчуваецца патрэба ў ільняным алеі, а апошні ляжыць бяз руху ў самым Магілеве (1½ вагоны). Запасаў цукру, солі і іншага досыць. Вось горш справа з мануфактурай.

Дырэктывы цэнтру не праводзяцца ў жыцьцё.

Аказваецца, у Магілеве не праведзена ў жыцьцё дырэктыва ўраду аб водпуску хлаба і мануфактуры ў першую чаргу здатчыкам лёну. Вось чаму і няма належнага пералому ў загатоўках ільнянай сыравіны.

Магілеўцам трэба падцягнуцца.

Нарада прызнала работу па загатоўках ільнянага валакна зусім нездавальняючай. Сучасны тэмп загатовак не гарантуе, што плян будзе выкананы.

Дадзены дырэктывы аб пяўхільным правядзеньні ў жыцьцё ўказаньняў цэнтру аб першачарговай прадажы хлеба і мануфактуры сялянам, якія здаюць лён.

Разам з тым пастаноўлена справу аб старшыні Глускай каапэрацыі і загадчыку Быхаўскай базы за непрасоўваньне ў вёску шкла перадаць у пракуратуру для прыцягненьня да судовай адказнасьці. В. З.

Што скажа на гэта Менскі аргандаль?

Зноў прыходзіцца пісаць аб брыдкіх зьявішчах у нашай загатоўчай кампаніі.

На гэты раз гутарка ідзе аб каапэратарах Колчаўскага і Башніцкага каапэратываў (Лагойскага райёну) і аб закупшчыку Нутчынскага каапэратыву (Койданаўскі райён).

У чым-жа справа? Ня больш і ня менш, як памянёныя каапэратары затрымалі карабейнікаў, гр. гр. Туніка і Гутэрмана, якія, згодна дагавору з Дзяржгандлем, вядуць загатоўку рызьзя.

Вось што пішэ ў сваёй заяве карабейнік Гутэрман:

«Каапэратары Колчаўскага і Башніцкага каапэратываў мяне затрымалі і сурова забаранілі, каб я больш ня ехаў зьбіраць рызьзё, ня гледзячы на тое, што я ім прад'явіў дагавор Дзяржгандлю». Другі карабейнік, Тунік, піша тое-ж самае (гэта было ў двох розных райёнах у Лагойскім і Койданаўскім).

Накопт усяго гэтага загадчык Менскім пунктам Дзяржгандлю робіць даклад свайму праўленьню: «Няма магчымасьці працаваць: каапэрацыя затрымлівае нашых людзей, і ўскладзены на нас плян па загатоўцы рызьзя ня можа быць выкананы».

Нам здаецца, што камэнтарыі непатрэбны; мы толькі да гэтага дадамо, што Дзяржгандаль дастаўляе рызьзё мясцовай прамысловасьці, а ў апошні час, згодна дырэктыў Наркамгандлю, павінен экспартаваць значныя партыі рызьзя. Для гэтае мэты, як вядома, у Менску адчыняецца спэцыяльная база па перапрацоўцы рызьзя, але калі памянёныя «руплівыя» каапэратары будуць нам рабіць такія перашкоды, то ясна, што карабейнікі, як народ бязьлівы, не пажадаюць ў далейшым весьці загатоўку.

Цікава, што накопт гэтага скажа аргандаль, які рэгулюе ў Менскай акрузе ўсе загатоўкі, і які ўскладае на Дзяржгандаль вялікія заданьні па загатоўцы і экспорту рознага роду сыравіны. А. Манін.

Загатоўкі ў Віцебшчыне.

УТВАРЭНЬНЕ ХЛЕБНАГА ФОНДУ.

Віцебск, 10-11. (Ад ул. кар.) На 1-га лютага ў Віцебску ўтворан хлебны фонд наступнымі арганізацыямі спажывецкая каапэрацыя—45.000 пуд. (75 проц. заданьня) і ЦРК—18.000 п. (40 пр. заданьня).

КОЛЬКІ ЗАВЕЗЕНА ХЛЕБА.

Віцебск, 10-2. (Ад ул. кар.). У працягу студзеня ў межы Віцебскай акругі было завезена: 154 тыс. жытніх прадуктаў, 94.000 п. пшаніцы, 23.000 пуд. крупы і 10.000 пуд. аўса.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Мэліярацыя на Аршаншчыне.

Ворша. У 1927 годзе к канцу сэзону мы мелі аформіленых 114 мэліярацыйных таварыстваў.

За мінулы год па лініі дзяржаўнай працы праведзена рэгуляваньне вадазбораў на працягу 15.255 кілёмэтраў. З аб'ёмам выемкі ў 69952,71 куб. мэтраў, што складае 109 проц. ад прадугледжанага ў вытворчым пляне.

Праведзена дасьледаваньне рэк, якія забалочваюць глебу працягам на 128,2 кілёмэтраў.

Мэліярацыйнымі таварыствамі зроблена дасьледваньне балотнай плошчы на 4662 гэктарах. Праведзена асушка на плошчы 1215 гэкт., што складае 109,7 проц. ад заданьня.

У параўнаньні з мінулымі гадамі, дзяржаўная праца па гідратэхніцы зьменшылася на 24,5 проц., а праца, праведзеная мэліярацыйнымі таварыствамі, павялічылася на 172 проц.

За мінулы год было ўзарана асушанай балотнай плошчы 81 гэктар.

Доўгатэрміновым крэдытам таварыствы забясьпечаны былі здавальняюча, не хапала толькі культурна-тэхнічнага пэрсаналу. Засталося не абслужана культурна-тэхнічным пэрсаналам 56 мэліярацыйных таварыстваў.

Балотна сенажатным інвэнтаром у мінулым годзе т-вы былі забясьпечаны на ўсе 100 проц.

Надалей АкрЗА ўзьнімае хадайніцтва перад АВК і НКЗ БССР аб павялічэньні як тэхнічнага, а таксама і апэрацыйна-кіруючага пэрсаналу, каб была магчымасьць ахапіць поўнасьцю ўсе мэліярацыйныя т-вы.

Мэліярацыйныя таварыствы будуць уцягнуты ў каапэрацыйную сэкцыю, якая будзе існаваць пры Акрсельсаюзе. АкрЗА канчаткова высьвятляе пытаньне сумесна з АВК аб арганізацыі каапэрацыйнай сэкцыі, якая дапаможа разьвіцьцю мэліяр. таварыствам.

Будзе наладжана шчыльная сувязь мэліярацыйнай працы з працай па землеўпарадкаваньню і лесаўпарадкаваньню, галоўным чынам будзе зварачвацца ўвага на адмежаваньне вучасткаў для мэліярацыйных таварыстваў.

Зварачваецца асаблівая ўвага на мэханізацыю культурна-тэхнічнай працы. С.

Сялянская ўзаемадапамога.

СПАГНАНЬНЕ ДАЎГОЎ.

Зараз па ўсіх к-тах праводзіцца кампанія спагнаньня даўгоў па старай запазычанасьці. Летась у часе сяўбы было выдана да 260 тысяч пуд. збожжа, а разам з даўнейшымі пазыкамі насельніцтва вінна к-там да 560 тысяч пуд. збожжа. Сёлета мяркуецца спагнаць да 300 тысяч пуд.

ШКОЛЫ АГНЯТРЫВАЛАГА МАТАР'ЯЛУ.

Віцебск, 10-II. Прэзыдыум Акрвыканкому намецію у гэтым годзе пабудаваць дзьве новыя школы з агнятрывалага матар'ялу.

РОСТ АШЧАДНАЕ СПРАВЫ.

Віцебск, 10-II. Зараз па акрузе налічваецца 8674 укладчыкі ў касы ашчаднасьці, сума ўкладаў якіх дасягае 563.082 руб. Супроць 1924 году лік укладчыкаў вырас на 176,5 проц., а сума ўкладаў на 1511,4 проц. Рабочыя і служачыя ахоплены касамі ашчаднасьці на 22 проц., а сялянскія ўклады складаюць толькі 0,8 пр. агульнага ліку сялянскіх двароў у акрузе.

ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЮ НА ВАДЗЯНУЮ ЭНЭРГІЮ.

Ворша, 10-II. Пабудованая ў Воршы райённая электрастанцыя будзе пераведзена ў 1928 годзе на вадзяную энэргію. Для гэтай мэты сёлета будзе ўстаноўлена 60-сільная вадзяная турбіна. Зараз на станцыі працуе 200-сільны рухавік.

КВАТЭРНАЕ БУДАЎНІЦТВА..

ВОРША, 6-II. Сёлета ў Воршы будуць пабудаваны 2 дамы на 16 квадэр для рабочых. Набудова дамоў будзе каштаваць 70 тысяч руб.

АДМЕНА ПЕРАВЫБАРАЎ КАМІТЭТАЎ.

Рэчыца, 10-II. Рэчыцкі райвыканком, улічваючы невыстарчальную яўку выбаршчыкаў і поўнае парушэньне ўстаноўленых выбарчых прынцыпаў, адмяніў выбары камітэтаў сялянскае ўзаемадапамогі у Бібічах, Васілевічах, Сямёнаўцы, Барвіках і Капанове.

КВАТЭРНАЕ БУДАЎНІЦТВА.

Бабруйск, 10-II. На кватэрнае будаўніцтва сёлета ў акрузе будзе затрачана 133.400 руб. Акрамя таго намечана адпусьціць яшчэ 70.000 руб. па лініі прамысловых прадпрыёмстваў. На гэтыя сродкі сёлетняй вясной будзе пачата пабудова трохпавярховага будынку ў Бабруйску, які разьлічаны на 42 кватэры для рабочых. Таксама распачнецца пабудова 4-ох і 3-ох кватэрных будынкаў, усяго на 17 кватэр. Асаблівая ўвага будзе зьвернута на рамонт кватэр рабочых. На капітальны рамонт мяркуецца затраціць 83.400 руб

ПАСТУПЛЕНЬНЕ СТРАХОЎКІ.

Бабруйск, 10-II. Да 1-га лютага па акрузе паступіла 389.085 руб. страхоўкі, або 58 проц. гадавога паступленьня. За другую палову студзеня паступіла страхоўкі 74.305 руб. Здача страхоўкі праходзе слаба.

УЗМАЦНЕНЬНЕ КРЭДЫТНЫХ ТАВАРЫСТВАЎ.

Бабруйск, 10-II. Акрсельбанк акрымаў 30.000 руб., якія будуць укладзены, ў капіталы крэдытных таварыстваў. Акрамя гэтага паступіла 25.000 рублёў крэдыту ў фонд беднаты.

СЫСКАНЬНЕ ПРАТЭРМІНОВАК ПА ПАЗЫКАХ

Мазыр, 10-2. Па даных акрсельбанку на першае лютага па сыстэме сельска-гаспадарчай крэдытнай каапэрацыі лічылася пратэрміновак па пазыках 74.608 руб. У студзені месяцы па ўсёй акрузе сыскана пратэрміновак на суму 16.440 руб. Праца па сысканьню разгортваецца і ёсьць надзея, што пратэрміноўкі будуць сысканы амаль што поўнасьцю.

Без сэкратара.

Ужо не адзін месяц старшыня Аміншаўскага сельсавету працуе без сэкратара. Працы ў сельсавеце шмат, асабліва ў нацыянальным. Выканаць яе адзін старшыня ня мае магчымасьці. Часта неадкладныя сялянскія справы не разглядаліся ў час, ня гледзячы на тое, што старшыня дзень і ноч заняты працай сельсавету.

На ахову працы саюз таксама не зьвяртае ўвагі. Некалькі разоў сельсавет прасіў РВК прысылаць сэкратара, бо на месцы не знаходзіцца. РВК на гэтыя просьбы ніякага адказу ня даў.

Спагадаючы.

Плешчаніцкі р., Меншчына.

Аб працы кіно на вёсцы.

За стацыянарку.

Адным з важнейшых відаў кінофікацыі вёскі зьяўляецца стацыянарка. Іншымі словамі, стацыянарка зьяўляецца ўжо найвышэйшаю ступеньню вясковага кіно. Стацыянарка лічыцца значна лепшай за перасоўку. Адгэтуль, зразумела, ня трэба рабіць вывадаў, што кінофікацыя вёскі павінна ісьці выключна па лініі стацыянарнага кіно. Гэткі пункт гледжаньня аказаў-бы вельмі дрэнную паслугу вясковай кінорабоце. Нельга ставіць разьвіцьцё вясковага кіно ў залежнасьці ад электрыфікацыі вёскі. А стаўка на стацыянарнае кіно прадугледжвае гэту залежнасьць. Гэтаксама з гэтага ня вынікае, што трэба нам адмовіцца ад разьвіцьця стацыянарнага кіно. Зразумела, не! Патрэбна толькі злучэньне гэтых двух відаў кінофікацыі вёскі. Стацыянарка можа і павінна быць устаноўлена ў першую чаргу ў райённым цэнтры, а потым і ў буйным электрыфікаваным сяле, у маючымся ці абсталяваным спэцыяльна для гэтага памяшканьні і налічваючым выстарчальную колькасьць насельніцтва, якое-б магло забясьпечыць нармальную работу стацыянаркі. Гэткім чынам перасоўка зусім не адхіляе стацыянаркі, а наадварот, узаемна дапаўняюць адна другую.

Наглядзім зараз, як разьвівалася вясковая стацыянарная кіно-сетка.

Стацыянарных кіно-установак у 1925 г.—7, у 1926 г.—15, у 1927 г.—29.

Сюды не ўваходзяць стацыянаркі былых павятовых і акруговых гарадоў, а таксама фабрычна-заводзкія і чыгуначныя, абслугоўваючыя адначасова з членамі прафсаюзаў і сялянства бліжэйшых вёсак.

Такім чынам мы маем рост стацыянарнай кіно-сеткі за апошнія два гады ў чатыры разы.

Што-ж спрыяла гэтаму росту?

Перш за ўсё—наліччa апаратуры і адпаведныя ўмовы продажу іх. Як гэта ні дзіўна, а якраз гэтыя абставіны зрабілі ў першы час уплыў на разьвіцьцё вясковай кіно-сеткі. Справа ў тым, што да 1926 г. у Беларусі ня было арганізацый, якія-б займаліся продажам апаратаў. Для набыцьця кіно-апарату трэба было камандыраваць прадстаўніка непасрэдна ў Маскву. Пры гэтым належыць улічыць, што крэдыт не даваўся. Вясковая арганізацыя, зразумела, ня можа адразу заплаціць за апарат і гэта затрымлівала разьвіцьцё вясковай сеткі.

Толькі ў 1926 г. Белдзяржкіно адчыніла ўласны магазын па продажу кіно-апаратаў і прыладаў. Цэны ўстаноўлены ня вышэй маскоўскіх і апроч таго даецца крэдыт. Гэта, зразумела, спрыяла найбольш шпаркаму росту стацыянарнай сеткі ў вёсцы.

Ня менш важным зьяўляецца тут і пракат. Напрыклад, у Беларусі мы можам бачыць, што стацыянаркі ўстаноўлены ў абсалютнай большасьці ў райённых цэнтрах і мястэчках. Калі ў адносіне пракату для вясковых кіно-перасовак, мы выходзім з таго, што пракатная палітыка нашых кіно-арганізацый павінна быць устаноўлена так, каб прадугледжвала пакрыцьцё поўнай часткі дэфіцыту па ўтрыманьню перасовак, дык у адносінах стацыянарнага кіно гэта адпадае. Утрыманьне стацыянарнага кіно ў райённым цэнтры не зьяўляецца дэфіцытным.

Камэрцыйны ўхіл шкодзіць рабоце.

Асноўная бяда навага стацыянарнага кіно ў вёсцы зьяўляецца ў адзнаку ад вясковай кіно-перасоўкі не ў дарагоўлі пракату (бо сярэдняя цана ўстаноўленая ў разьмеры 13 р. зьяўляецца зусім нармальнай), а ў камэрцыйным ухіле. Камэрцыйны ўхіл у вясковай кіно-рабоце бывае часта такі моцны, што ён буквальна заганяе значэньне кіно, як этапу паліт-асьветнай працы далёка на другі плян. Калі на перасоўках пры данамозе кіно праводзіцца значная палітасьветная праца, дык на стацыянарных кіно гэтага няма. Ня гледзячы на тое, што магчымасьці тут значна большыя, чым на перасоўках. Здавалася-б, што спэцыяльна прыстасаваныя памяшканьні, утульныя, ясныя і г. д. павінны спрыяць выкарыстаньню кіно для вядзеньня палітасьветнай працы вакол яго, але на вялікі жаль у практыцы нашай працы мы гэтага ня бачым. Ніякай палітасьветнай працы вакол кіно не вядзецца. Ня гледзячы на тое, што стацыянарнае кіно знаходзіцца ў райённых цэнтрах, дзе насельніцтва вельмі разнастайнае, дзе маюцца беднякі, сераднякі, кулакі, гандляры і г. д., дзе кіно можа і павінна быць выкарыстана для яшчэ большага аб'яднаньня беднаты і серадняцтва вакол партыі і савецкай улады супроць кулакоў і вясковых нэпманаў, дзе кіно сапраўды павінна служыць „магутным сродкам камуністычнай агітацыі і прапаганды", усё-ж кіно ў гэтых мэтах далёка не выкарыстоўваецца. Трэба раз назаўсёды ўстанавіць, што вясковае стацыянарнае кіно—гэта не камэрцыйны тэатр. Можна і трэба, зразумела, і з вясковага стацыянарнага кіно атрымліваць пэўную частку прыбытку, якая ў абавязковым парадку павінна ісьці выключна на далейшае разгортваньне кіно-сеткі ў гэтым райёне, але кожны кіно-сэанс павінен абавязкова праводзіць палітасьветную працу. Асноўная палітасьветная праца павінна зьмяшчаць у сабе правядзеньне гутарак на тэму па зьместу карціны. У райённых цэнтрах, дзе знаходзяцца стацыянарныя кіно, маецца вытарчальная колькасьць культурных сіл, якія могуць праводзіць гэтую працу. Трэба толькі гэтага захацець і паставіць сабе задачай.

За танны білет.

Камэрцыйны ўхіл таксама заўважаецца і ў палітыцы цэн. Цэны на білеты ў стацыянарных кіно надзвычайна высокія. У сярэднім гэтыя цэны ўстаноўлены ад 15 да 40 кап., а ў рэдкіх выпадках ад 10 кап. Гэткія цэны недаступны значнай частцы насельніцтва. Гэткія цэны не таньней цэн некаторых гарадзкіх кіно-тэатраў. Для прыкладу возьмем кіно-тэатр «Культура», які знаходзіцца ў цэнтры Беларусі, у Менску, маючым спэцыяльна абсталяванае памяшканьне з вялікім фойэ, шахматнашашачнымі паколямі, ясными, цёплымі і ўтульнымі, дзе ўстаноўлены лепшыя заграніччныя апараты, дзе ставяцца лепшыя карціны савецкай вытворчасьці і ў часе дэманстрацыі карцін грае вялікі сымфанічны аркестр і, ня гледзячы на ўсё гэта, цэны ўстаноўлены ад 10 да 40 кап. Ці можна пасьля гэтага сказаць, што цэны ад 15 да 40 кап. у вёсцы зьяўляюцца нармальнымі? Вядома не! Кожны нармальны чалавек гэта пацьвердзіць. Устанаўленьне такіх цэн на справе азначае адрыў кіно ад беднаты і найменш забясьпечанай часткі насельніцтва. Возьмем для прыкладу сям'ю з 4-5 душ, якой для таго, каб паглядзець хоць-бы два разы ў месяц кіно, ёй трэба прыблізна паўтара-два рублі. Гэткая сума непасільна значнай частцы вясковага і местачковага насельніцтва. Гэта трэба заўсёды памятаць. Нельга будаваць кіно для абслугоўваньня толькі найбольш забясьпечанай часткі насельніцтва. А аб гэтым на вялікі жаль часта забываюць. Там, дзе людзі захапляюцца „камэрцыяй", там часта і ідэалёгія адыходзіць на другі плян. З практыкі Белдзяржкіно можна паглядзець выпадкі, калі замест назначаемых карцін рэвалюцыйных, ідэалёгічна вытрыманых савецкай вытворчасьці, просяць заграніччныя «баявікі» авантурніцкага і дэдэктыўнага характару, у абсалютнай большасьці ідэалёгічна неадпаведнымі, а часта проста шкодныя. І ўсё гэта апраўдваецца тым, што нібы заграніччныя карціны камэрцыйна больш выгадныя, больш «касавыя». Мы, зразумела, у гэтым сумняваемся.

За добрую савецкую фільму.

Практыка гарадзкой працы паказвае, **што савецкія рэвалюцыйна-мастацкія карціны зьяўляюцца камэрцыйна больш выгоднымі, чымся заграніччныя.** Гэта проста сьведчыць, што вясковая кіно-праца пастаўлена яшчэ вельмі дрэнна. **Трэба прывучаць гледача да савецкай здаровай карціны, а не да заграніччнай агіднасьці.** Кантралюючым органам належыць выняць з вясковага пракату ўсе заграніччныя, авантурныя і інш. карціны сацыяльна-шкодныя. Куды лепш стаіць справа ў вясковым фондзе з перасоўкамі, дзе заграніччныя карціны зусім адсутнічаюць. **Трэба пакласьці канец скажэньню прыцыповае ўстаноўкі ў вясковай кіно-працы.** На мясцох гэтай працай кіруюць культадзелы РВК, дык чаму-ж нельга ім напомніць, да так, каб яны ўрэшце ўявілі, што кіно на вёсцы павінна служыць камуністычнай асьвеце мас, а ня крыніцай выкачываньня сродкаў. Цэны на білеты павінны быць пераглядзены і значна зьніжаны. Цэны павінны быць вызначаны ня больш, чымся ад 10 да 25 кап. Танныя білеты павінны прадавацца выключна членам прафсаюзаў, батрацтву і бяднняцкай частцы насельніцтва праз камітэты ўзаемадапамогі, выдзяляючы на кожны сэанс асобна процантаў 10 дармовых білетаў. Зьніжэньне цэн зусім не адаб'ецца на бюджэце кіно. Сэансы праходзяць далёка ня з 100 проц. нагрузкі. Недагрузка вельмі часта тлумачыцца высокімі цэнамі. Зьніжэньне іх бязумоўна выкліча павялічэньне наведваньня, што ў выніку зусім не адаб'ецца на прыбытковай частцы бюджэту, а ў большасьці выпадкаў нават павялічыць.

Па стацыянарцы на райён.

Разьвіцьцё стацыянарнага кіно, таксама як і перасоўнага, ідзе вельмі павольна. Калі ўзяць Беларусь, то мы маем стацыянарнае кіно толькі ў 25 проц. усіх райёнаў, а ў іншых рэспубліках і таго горш. Трэба паставіць сабе задачаю ў бліжэйшыя гады арганізаваць хоць-бы па адзэй стацыянарцы на кожны электрыфікаваны райён. Гэтая задача зьяўляецца цалкам ажыцьцявімай. Пры сучасным становішчы, калі кожны райён мае свой самастойны бюджэт, ён бязумоўна здолее выдзеліць пэўную суму на набыцьцё стацыянаркі. Тым больш, што ў пакупцы апарату вельмі часта бяруць удзел ня толькі РВК, але і іншыя грамадзкія арганізацыі, як, напр.—прафсаюзы, каапэрацыя і г. д. Трэба наблізіць продаж апаратаў да спажыўцоў. А галоўнае трэба палепшыць умовы продажу. Пры ўмове налічнага разрахунку, ці нават кароткатэрміновага крэдыту, апараты за некаторым выключэньнем ніхто купляць ня будзе. Калі мы сур'ёзна паставім пытаньне аб кінофікацыі вёскі, то трэба пераглядзець пытаньні крэдыту пры продажы апаратаў. Крэдыт павінен быць прадастаўлен ад 5-ці да 12-ці месяцаў. Гэта дае магчымасьць пакрываць кошт апарату з бюджэту 2-х гадоў. Белдзяржкіно павінны быць прадастаўлены рэзэрвовыя капіталы для гэтае мэты. Трэба зьнізіць кошт апаратаў. Як гэта ні дзіўна, а зьніжэньне цэн, якое праводзіцца партыяй і савецкаю ўладаю, зусім не закранула арганізацыі, якія выпускаюць кіно-камплекты. Белдзяржкіно да гэтага часу прадавала поўныя камплекты па цане 1100-1150 руб., а цяпер само прымушана плаціць 1400-1700.

Дзе-ж тут зьніжэньне цэн?

Няўжо партыйныя і савецкія дырэктывы аб зьніжэньні цэн не распаўсюджваюцца на арганізацыі, выпускаючыя кіно-камплекты? Трэба адкрыта сказаць, што ў гэтай галіне існуе поўная анархія. Гэта тлумачыцца,

У САВЕЦЕ НАР. КАМСІАРАЎ БССР

(Аб'яднанае пасяджэньне СНК і Эканомнарады БССР 8-II—1928 г.).

На гэтым пасяджэньні разам з іншымі былі разгледжаны наступныя пытаньні.

КАН'ЮНКТУРА НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ БССР ЗА 1926-27 г.

На гэтым пасяджэньні быў выслуханы даклад Дзяржаўнай Плянавай Камісіі пры СНК аб кан'юнктуры народнай гаспадаркі БССР за 1926-27 г. і за 1-шы квартал 1927-28 г.

Для апрацоўкі рэзалюцыі складзена камісія, якой даручана падаць праект рэзалюцыі на зацьверджаньне СНК пра тыдзень.

Падрабязная інфармацыя аб кан'юнктуры будзе дадзена асобна.

АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ Ў БССР СЬВЯТКАВАНЬНЯ 10-ГОДЗЬДЗЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

СНК выслухаў даклад Старшыні Цэнтральнай Камісіі па правядзеньні ў БССР сьвяткаваньня 10-годзьдзя Чырвонай арміі тав. Казюры аб рабоце гэтай камісіі.

СНК запрапанаваў Цэнтральнай Камісіі распрацаваць з удзелам зацікаўленых ведамстваў і Кіраўніцтва спраў СНК праект пастановы СНК аб палёгках для чырвонаармейцаў, камандзіраў складу і іншых удзельнікаў грамадзянскай вайны і падаць на зацьверджаньне СНК. СНК таксама пастанавіў выдаць у распараджэньне Цэнтральнай Камісіі 20 тыс. р. на палепшаньне культурнага і бытавога абслугоўваньня чырвонаармейцаў вайсковых часьцей, у тым ліку і прыгранічных часьцей, разкватараваных на тэрыторыі БССР, прыняўшы пад увагу таксама і падшафныя Беларускаму Ўрэду вайсковыя часткі.

АБ БУДЫНКАХ НА БЫЎШАЙ ЦАРКОЎНАЙ ЗЯМЛІ.

СНК прыняў распрацаваны КЗП пры СНК БССР праект пастановы ЦВК і СНК пра будынкі на быўшай царкоўнай зямлі. Паводле гэтай пастановы ўсе будынкі на быўшай царкоўнай зямлі, прызнаныя ўласнасьцю дзяржавы, зьяўляюцца маемасьцю мясцовых саветаў і знаходзяцца ў гарадох пад ведамам гарадзкіх саветаў, а ў сельскіх мясцовасьцях і мястэчках—пад ведамам раённых выканаўчых камітэтаў.

НАЗНАЧЭНЬНІ.

Савет Народных Камісараў назначыў т.т. Папялушку А.І., Смулевіча Б. Я., Шастакова М. Л. і Арцем'ева В. Я. членамі калегіі пры кіраўніку ЦСУ БССР, а таксама назначыў т. т. Валасевіча П. І., Вансоўскага В. А., Абрамчука М. П., Рывеса С. М., Некрашэвіча С. М. і Жылуновіча З. Т. членамі калегіі пры Народным Камісарыяце Асьветы БССР.

Праца не прапала дарма.

Намесьнік старшыні Менскага АВК тав. Нахільніцкі ў пачатку лютага выехаў у Узьдзенскі раён для азнаямленьня з ходам працы па рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі, загатовак экспортных прадуктаў і па спагнаньні нядоімачных плацяжоў.

Вярнуўшыся гэтымі днямі з паездкі, тав. Нахільніцкі паведаміў нашаму супрацоўніку наступнае:

У Узьдзенскім раёне была праведзена вялікая праца сярод насьленьня на папулярызацыі новай пазыкі, па экспортных загатоўках і аб неабходнасьці спагнаньня нядоімачных плацяжоў.

Асноўная частка вёсак гэтага раёну актыўна падтрымлівае мерапрыёмствы, якія праводзяцца па гэтых пытаньнях; асабліва добра адносіцца беднота. У некаторых выпадках беднякі дэманстрацыйна выступалі ўперад і падпісваліся на пазыку на даволі значныя сумы.

Мясцовыя арганізацыі і ўстановы правялі нарады з удзелам вясковай інтэлігенцыі, на якіх абгаварваліся пытаньні рэалізацыі пазыкі. Настаўніцтва, з свайго боку, правяло гутаркі ў старшых групах сямігодак. Наогул, на сходах, прысьвечаных рэалізацыі пазыкі, асабліва актыўна выступае настаўніцтва.

Праца дарма не прапала: за студзень па Узьдзенскім раёне ёсьць наступныя вынікі:

Сельска-гаспадарчы падатак выкананы на 87,6 проц. гадавога заданьня; страхоўка—на 68,1 проц., запазычанасьць па плацяжох за дзяржаўную зямельную маемасьць наступіла ў суме звыш 430 руб. і за земляўпарадкаваньне—610 р.; па прамысловым падатку—5.655 р.; па розных штрафах—1.300 р.; паступіла паёў у каапэрацыю—1.830 р.; рэалізавана пазыкі на 470 руб.

На загатоўках ёсьць наступныя вынікі: загатоўлена збожжа—79 тон; ільнянага семя—4,5 тоны; скур-сырцу—на 1.300 руб.; пушніны на 4.300 р.; шчаціны і конскага воласу на 2.600 р.; грыбоў—на 2.300 руб.; рызьзя—на 4.600 р. і іншых экспортных прадуктаў—на 2.100 руб.

134 беспрацоўных будуць карыснымі для пралетарскае дзяржавы

(Адчыненьне настаўніцкіх курсаў для беспрацоўных.

8-га лютага г. г. у памяшканьні 2-ой Савецкай школы адбыўся арганізацыйны сход курсантаў, прысьвечаны дню адчыненьня настаўніцкіх курсаў для беспрацоўных.

Усяго на гэтыя курсы было пададзена 250 заяў, але залічана курсантамі 134, з іх 24 кандыдаты.

Заля перапоўнена курсантамі і пабочнымі асобамі, жадаючымі, паступіць на гэтыя курсы, але па якіх небудзь прычынах ня прынятымі.

А 8-й гадзіне ўвечары загадчык курсамі тав. Жураўскі адчыніе агульны сход. Радасныя твары курсантаў спатыкаюць нашых прадстаўнікоў улады і педагогаў, якія вітаюць з пачаткам заняткаў, на курсах. Тав. Жураўскі інфармуе аб жыцьці і рабоце вясковага настаўніка. Ён кажа, што вясковы настаўнік ня толькі павінен вучыць дзяцей чытаць і пісаць, а ён павінен быць настаўнікам актывістам ды памагаць сялянству выходзіць з цемры.

Прадстаўнік ад Наркамасьветы заначае, што курсанты выключна падрыхтоўваюцца ў настаўнікі для вёскі. Ён гаворыць, што настаўніцкая пасада зьяўляецца надзвычай важнай і адказнай, бо настаўнік у вёсцы ёсьць апора для сялянства, пагэтаму яму трэба быць чулым і ўмела падыходзіць да сялянства, каб заваяваць з іх боку аўтарытэт.

Прадстаўнік ад цэнтральнага праўленьня саюзу асьветы вітае курсантаў і выносіць пажаданьне, каб гэты выпуск зьяўляўся адным з прыкладных, дзейных настаўнікаў, а для гэтага з боку выкладчыкаў будзе зьвернута асобная ўвага, каб з курсантаў выкаваць работнікаў, адпавядаючых прызначэньню настаўніка, які мог-бы распаўсюджваць свае веды сярод сацэн дзяцей і дарослага насельніцтва, а таксама і культурныя навыкі, якія неабходны для перайначваньня старога жыцьцёвага ўкладу на новых сацыялістычных пачатках.

Курсант Д. Х.

ЯШЧЭ АДЗІН АЧАГ ДЛЯ БЯСПРЫТУЛЬНЫХ.

У часе ўрачыстасьціў Кастрычнікавай рэвалюцыі дзелавіта і бяз лішняй нашумівасьці амаль што на самай ваколіцы гораду, каля вакзалу, 8 лістапада мінулага году адчынен новы ачаг для бясприпрытульных дзяцей дашкольнага ўзросту. Мізэрны адпаверхавы драўляны будынак з уваходам в двара пакідае жадаць шмат лепшага. Невялікія і пакоі ў гэтым ачагу, дзе з дзевятай гадзіны раніцы да пятай гадзіны вечара знаходзяць сабе прытулак і разумнае кіраўніцтва 32 маленькіх дзяцей—17 хлопчыкаў і 15 дзяўчынак—пераважна чатырох і пяцігадовага ўзросту, якія ня маюць бацькі, дзеці адзіночак - матак і ў дадатак да гэтага ў большасьці беспрацоўных. Тут атрымліваюць яны а адзінаццатай гадзіне сьнеданьне—кубак кавы з малаком ці гарбаты, сьвежую булку з маслам і каўбасой, а другой гадзіне абед з дзьвюх патраў—булён з мясам, катлеты, манная каша і г. д.

Тут паступова прывіваюцца ім калектыўныя, антырэлігійныя і гігіенічныя навыкі, тут іх песьняць і добра да іх адносяцца.

* * *

— Ёсьць маткі, якія жывуць у страшэнна дрэнных умовах,—гаворыць мне настаўніца гэтага маленькага ачагу для бясприпрытульных. Аднаго з гэтых дзяцей мы знайшлі ў вільготным сутарэньні з мокрымі сьценамі і столяй, якая кожную хвіліну пагражала абваліцца.

— Ну, а які іх сацыяльны стан?—пытаюся.

— Дзеці рабочых і менская беднота, якім літаральна няма куды дзецца.

— Мы праводзім з імі вялікую педагагічную працу,—гаворыць далей настаўніца,—сьпяваем хорам дзіцячыя рэвалюцыйныя песьні, вывучаем лёгкія вершы, прызвычайваем іх да калектыўнага карыстаньня цацкамі і г. д.

— Скандаляць і б'юцца яны між сабой, паўна, часта?

Усьміхаецца і адказвае:

— Зразумела, здараецца і гэта. Але характэрным зьяўляецца тое, што ў нас ёсьць чатыры яўрэі, а між тым ніякага антаганізму не заўважаецца. Жывуць дружна адной сям'ёй.

* * *

— Дзядзька, сядайце,—кажа мне хлапчук, падсоўваючы маленькае дзіцячае крэсла.

Дзеці абкружаюць мяне шчыльным колам і зацікаўлена разглядаюць незнаёмага ім чалавека.

Усе яны выглядаюць здаровымі і чыста ўбранымі. Відаць клопаты жанчыны, відаць любоўныя і сур'ёзныя адносіны да справы.

Так, вялікая добрая справа робіцца ў маленькім будынку па Сураскай вуліцы!

Вялікая справа—савецкая!

Н. Б.

СПРАШЧЭНЬНЕ СУДОЎ.

За выбрыкі адміністратараў дзяржава сваімі сродкамі адказваць ня можа.—Асобы, які парушаюць кодэкс законаў аб працы, павінны несьці матар'яльную адказнасьць.

Бюджэтная дысцыпліна не павінна парушацца.

З практыкі працы тарыфна-канфліктных і судовых органаў відаць, што адміністратары ўстаноў і прадпрыёмстваў, карыстаючыся правам найму і звальненьня рабочай сілы, утвараюць вусім беспадстаўныя канфлікты. Гэтыя канфлікты сьвядома зацягваюцца: першыя пастановы тарыфна-канфліктных і судовых органаў абскарджваюцца ў наступныя органы; справы цэлымі месяцамі ходзяць па інстанцыях.

Вышэйшыя судовыя ці тарыфна-канфліктныя інстанцыі ў большасьці выпадкаў зацьверджаюць пастановы ніжэйшых, вынесеныя па карысьць працоўных. Адміністратары гэтым не здавальняюцца і «скардзяцца» далей, думаючы:

— А мо' як-небудзь удасца справу выйграць.

Першая пастанова зацьверджаецца, і ўстанова плаціць за змушаны прагул.

Такіх прагулаў, якія вынікаюць не на віне ўстановы, а адміністратараў, шмат. Дзесяткі тысяч рублёў цяжарам кладуцца на бюджэт у той час, калі бюджэтная дысцыпліна павінна быць недатыкальнаю.

Справа на абгаварэньне мас.

Гэтымі недарэчнасьцямі ў справе працоўных судовых спраў зацікавіліся наркаматы—РСІ, Працы, Грашовых Спраў і Юстыцыі. Справа вынесена на абгаварэньне шырокіх колаў працоўных. Побач з працоўнымі судовымі справамі 9 лютага на сходзе, скліканым па ініцыятыве НК РСІ і саюзу савецкіх і гандлёвых служачых, абгаварваліся і пытаньні спрашчэньня судовай справы наогул.

Вось што пра гэта кажуць рабочыя і служачыя:

Справы цягнуцца па некалькі год.

— Доўга пакутуюць судовыя справы, пакуль дабяруцца да суду,—кажа тав. Карначоў,—павялічваецца. За апошні час яны павялічылася на 45 пр. Дайшло да таго, што за адзін пуд сена коштам у 45 капеек, селянін судзіцца некалькі год.

Некаторыя артыкулы нашых судовых законаў пабудаваны так, што прывучаюць нас да валакіты. Судовыя законы неабходна пераглядзець.

За валакіту—да адказнасьці.

Тых адміністратараў, якія паўмысля скардзяцца ў вышэйшыя канфліктныя органы на пастановы ніжэйшых, неабходна прыцягваць да адказнасьці. Яны павінны адказваць за кожны прагул рабочага ці служачага сваімі грашыма.

Адным з буйных недахватаў у працоўных судовых справах зьяўляецца тое, што ў кожнай інстанцыі справа «па законнай падставе» затрымліваецца доўгі час. Усе тэрміны прахаджэньня спраў неабходна скараціць да мінімуму. У працягу аднаго месяца павінен быць вырашан увесь канфлікт. Да гэтага часу бывалі выпадкі, што ўстановы плацілі за паўгода і больш змушанага прагулу.

Працоўныя згаджаюцца з прапановамі аб спрашчэньні судоў.

Сход у асноўным згадзіўся са ўсімі прапановамі, высунутымі НК РСІ ў справе зьнішчэньня валакіты ў працоўных судовых справах і, наогул, у судовых справах.

Да гэтых прапаноў далучаны дадаткі НК Юстыцыі на спрашчэньні працоўных судоў.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра пашырэньне на тэрыторыю быўшых Гомельскага і Рэчыцкага паветаў артыкулу 79 Крымінальнага Кодэксу БССР.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць замест артыкулу 79 Крымінальнага Кодэксу РСФСР (З. З. РСФСР 1926 г., № 20, арт. 159) пашырыць на тэрыторыю быўшых Гомельскага і Рэчыцкага паветаў артыкул 79 Крымінальнага Кодэксу БССР (З.З. БССР 1926 г., № 43, арт. 163).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

9 лютага 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

о распространении на территорию бывших Гомельского и Речицкого уездов ст. 79 Уголовного Кодекса БССР.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют взамен ст. 79 Уголовного Кодекса РСФСР (С. У. РСФСР 1926 г., № 20, ст. 159) распространить на территорию бывших Гомельского и Речицкого уездов ст. 79 Уголовного Кодекса БССР (С. З. БССР 1926 г., № 43, ст. 163).

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. ЧЕРВЯКОВ.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

9 февраля 1928 г.
г. Минск.

НАВУКА І ТЭХНІКА.

Новы спосаб здабываньня торфу.

Савецкія інжэнэры Класон і Кірпічнікаў адшукалі надзвычайна практычны спосаб здабываньня торфу з дапамогай вадзяной струі высокага ціску; здабыты такім спосабам торф завуць гідраторфам. Размочаны моцнай струёй торф ператвараецца ў жыдкую кашу. Гэта каша засмоктываецца ў спэцыяльныя праведзеныя на тарфянаму вучастку трубы- „торфасмокты" і па іх гоніцца туды, дзе торф сушыцца. Там пасьля сушкі торф рэжуць на кавалкі, прэсуюць— і пасьля гэтага торф гатоў ісьці на апал.

Зараз спэцыялістыя на тарфянай справе абмяркоўваюць пытаньне наконт штучнай сушкі торфу; гэта яшчэ больш скароціць тэрмін апрацоўкі торфу і гэтым зробіць яго больш танным.

Чорнае золата.

Здабываемае ў розных частках сьвету золата мае досыць рознастайны і характэрны для даўгай мясцовасьці колер. Напрыклад, уральскае золата мае чырвоны водпераў, каліфорнскае—значна жаўтейшае. Таксама вядома золата белае, блакітнае і г. д. Нядаўна ў аўстралійскіх рудніках рабочыя знайшлі жылку чорнага золата. Як толькі дастанеш гэта золата з руды, яно мае белы срэбраваты бляск. Праз некалькі гадзін на паветры золата робіцца густа-чорным.

Геолёг тлумачыць такое цікавае зьявішча тым, што гэта золата мае некаторыя солі вісмута, якія на паветры хутка акісьляюцца і мяняюць свой колер.

Авіясыгналізатар для начных палётаў.

Загадчык дасьледчага аддзелу амэрыканскай электрычнай кампаніі Вэстынгаўза ў Пітсбурзе С. М. Кінтэр надумаў цікавую прыладу, якая мае аграмаднае значэньне для паветраных зносін ночу.

У яго прыладзе ёсьць мікрафон з узмацненьнем, я і дазваляе лавіць шум аэраплана далёка перад тым, як яго можна начуць голым вухам.

Злоўлены мікрафонам гук з дапамогай гэтага апарату аўтаматычна запальвае сыстэму электрычных лямпаў аэрадрому і такім чынам паказвае самалёту месца для спуску.

Гэта самая вынаходка ў часе вайны будзе сыгналізаваць аб набліжэньні самалёту ворага.

30.000 землетрасеньняў у год.

Па дасьледах амэрыканскага геолёга прафэсара Вільсона, на зямлі кожны год адбываюцца 30.000 землятрасеньняў. З іх усяго 60 дасягаю значнай сілы і каля 30 бываю з катастрафічнымі вынікамі. Зусім нядаўна ўсе сэйсмографічныя станцыі Эўропы і Амэрыкі адзначылі землятрасеньне надзвычайнай сілы, асяродак якога знаходзіўся на дне акіяну, недзе каля Аляскі. Гэта землятрасеньне было ў пустынай вобласьці і амаль што не нарабіла ніякай шкоды.

Найвялікшыя нішчасьці бываюць ад землятрасеньняў, якія адбываюцца ночу і ў зімовую пару.

Хроніка.

Дзяржаўнае страхаваньне.

Страхаваньне транспарту.

Праўленьне Дзяржстраху разьмеркавала заданьні па дабрахвотным страхаваньні транспарту на 1927-28 г. у суме 20000 р. Будуць застрахоўвацца чыгуначныя грузы, матар'яльныя сілаўныя і інш.

Рэстраты ў Слуцкім страхагенцтве.

Пры абсьледваньні Слуцкага страхагенцтва былі выяўлены значнасты з боку б. памоцніка страхагента Гошко, які на працягу 3-х год рабіў сыстэматычныя растраты і падлогі, у выніку чаго аказаўся недахоп 2801 руб.

Злачынца арыштаван. Апрача гэтага, праўленьнем Дзяржстраху зьнят з пасады сучасны загадчык Слуцкага агенцтва Камінскі, які нядбайна адносіўся да працы, вынікам чаго зьявілася растрата.

Страхавыя прэміі вэтэрынарным працаўніком.

Дзяржстрах адпусьціў НКЗему 3010 руб. для прэміраваньня вэтэрынарных працаўнікоў за лепшую працу па дабрахвотным страхаваньні.

Прэміі будуць выдавацца ў 1929 годзе ў разьмеры 125, 100, 70, 50 і 30 руб. Усяго 40 прэмій.

Вечар-дыспут полымцаў у Горках.

Учора ў Горкі выехалі сябры беларускага аб'яднаньня пісьменьнікаў „Полымя": Янка Кучала, Цішка Гартны, М. Грамыка, М. Зарэцкі, Александровіч і Дузар.

У С.-Г. Акадэмі пісьменьнікі наладзяць вечар-дыспут на тэму „Шляхі беларускае літаратуры". Акроч таго, у г. Воршы адбудуцца выступленьні гэтых пісьменьнікаў у рабочых клюбах.

Кастрычнікавы прызыў скончан.

У часе кастрычнікавага прызыву па Менскай акрузе прынята рабочых у кампартыю 1084 чал.

Кастрычнікавы прызыў скончан 1-га лютага. Зараз пачнецца праца па сталаму ўцягненьню рабочых у партыю.

Сёньня адчыняецца партыйная кіно-нарада.

Сёньня, 11 лютага, пры АПА ЦК КП(б)Б адчыняецца партыйная кіно-нарада. На нарадзе будзе заслухан даклад аб выніках і пэрспэктывах працы Белдзяржкіно, даклад ЦКК-РСІ аб абсьледваньні працы Белдзяржкіно і інш.

Усебеларускі зьезд сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі 15 сакавіка.

Скончылася перавыбарчая кампанія ленных камітэтаў сялянскай узаемадапамогі. Зараз падагульваюцца вынікі перавыбарчай кампаніі і вядзецца ўзмацненая падрыхтоўка да ўсебеларускага зьезду сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі, які адбудзецца 15 сакавіка.

За валакіту—да адказнасьці.

Калегія Нар. Кам. РСІ ўстанавіла палічча валакіты з боку Церахаўскага РВК у вырашэньні спраў сем'яў чырвонаармейцаў па выдачы ім пэнсіі і прадастаўленьні ільгот.

Справа перададзена пракурору рэспублікі для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

Рэалізацыя білетаў Усесаюзнай Озет-лётарэі.

Да гэтага часу па БССР рэалізавана 54.000 білетаў Усесаюзнай Озет-лётарэі. Першымі па распаўсюджваньні білетаў ідуць Менская і Полацкая акругі. Зусім слаба распаўсюджваюцца білеты ў Магілеўскай і Мазырскай акругах. Кампанія па рэалізацыі білетаў павінна быць скончана да 1 красавіка.

Вялікая зацікаўленасьць да Музэю Рэвалюцыі.

Наглядаецца вялікая зацікаўленасьць з боку працоўных да Музэю Рэвалюцыі. Так, за апошні месяц Музэй Рэвалюцыі наведала 1.180 чал. рабочых, сялян і чырвонаармейцаў.

С.-г. курсы для дарослых сялян.

20 лютага ў 3 раёнах Менскай акругі адчыняюцца 2-хмесячныя курсы для дарослых сялян. Мэта курсаў—даць неабходныя веды сялянам па сельска-гаспадарчай асьвеце. На ўтрыманьне курсаў адпушчана 500 руб.

Курсы дзесятнікаў-торфмайстраў.

25 лютага ў Менску адчыняюцца 5-цімесячныя курсы для падрыхтоўкі дзесятнікаў-торфмайстраў. На курсы будзе прынята 40 слухачоў, палова з іх будзе атрымліваць стыпэндыі. Слухачы будуць камплектавацца з членаў тарфяных т-ваў і інш. каапэрацыйных аб'яднаньняў.

Новыя фабрычна - заводзкія сямігодкі.

Наркамасьветы БССР у бягучым навучальным годзе адчыніе яшчэ 2 новыя фабрычна-заводзкія сямігодкі. Апошнія арганізуюцца—пры Дубровенскай фабрыцы і на МБВ чыгунцы пры быўш. 3 чыгуначнай сямігодцы.

Крэдыт рабочым і служачым.

Менскі ЦРК з канца сьнежня 1927 году да 8 лютага выдаў рабочым і служачым крэдыт на агульную суму 295.000 руб. З гэтай сумы 65.000 руб. прыпадае на дробны крэдыт.

Пушніна для рынку БССР.

Управа Белдзяржгандлю РСФСР заключыла дагавор з Управай Белдзяржгандлю аб рэалізацыі ў БССР апрацованай пушніны. Разам з тым Управа Белдзяржгандлю ўсю сырую пушніну, якая ідзе спэцыяльна для ўнутранага рынку, будзе перадаваць Управе Дзяржгандлю РСФСР.

Забойства з-за глупства.

1 жніўня 1927 г. гр. вёскі Завішыня, Узьдзенскага раёну, Хведар Сьцапанаў Дубовік пусьціў свае коні на пазасу суседа Якімовіча. Калі апошні пачаў згоняць коні Дубовіка, паміж імі завязалася бойка, у часе якой Дубовік нанёс Якімовічу нажом 8 ран, ад чаго Якімовіч і скананў. Менскі акруговы суд прыгаварыў Хведара Дубовіка на восем год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем, але на аснове амністыі скараціў кару напалову.

Пабудова 4 новых заводаў.

З 1-га лютага Ўправа Белдзяржгандлю ўзяла на сябе ўсю працу па загатоўцы кітак.

Маркуецца загатоўку гэтай сыравіны значна пашырыць. Зараз распрацоўваюцца пляны пабудоўкі 2 новых кітачных і 2 альбумінавых заводаў. У бліжэйшыя часы пляны і каштарысы гэтых заводаў будуць прадстаўлены на зацьверджаньне Дзяржплану БССР.

1.034.000 руб. на каналізацыю і вадаправоды.

Цэнтральны Камунальны Банк СССР сёлета адпускае на работы па каналізацыі ў Менску 750.000 руб. і 284.000 руб. на пашырэньне і перабудову вадаправодаў у розных гарадох БССР.

Батракі і беднота—у першую чаргу.

ЦК саюзу с.-г. рабочых указала сваім нізавым арганізацыям, каб па лесараспрацоўках і вывазцы лесу работа давалася ў першую чаргу батрацтву і беднаце. ЦК саюзу таксама падкрэсьліла, што ня трэба дапускаць заключэньня агульных працоўных умоў, а заключаць іх асобна на распрацоўку лесу і вывазку, каб даць работу больш бедным.

Старыя прывычкі.

31-га студзеня прыходзіць у амбулаторыю вакзальнага раёну старык-рабочы зрабіць перавязку. Пастаўшы ў чарзе, ён напаўзе да першых „збаўцаў" і не аглядзеўся, як перавязка была зроблена. Адчыняюцца дзьверы хірургічнага кабінэту, адкуль чуваць гро нае—„валісь, там абуецеся". Стары выходзіць у чакальню босы з хворымі нагамі на халодную, мокрую і брудную падлогу, трымаючы ў руках боты з анучамі.

Праз некалькі хвілін у дзьвярох кабінэту зьяўляецца мэдрапрацаўнік Г. Грамадзянства абураецца гэткім учынкам, а яму хоць бы што.

А вось яшчэ і другі выпадак у гэты самы вечар.

Прынесьці грамадзянка дзіцё з разьбітым носам дзеля аказаньня хуткай дапамогі. Амбулаторыя катэгарычна адмовілася зрабіць перавязку, а запрапанавала ёй панесьці дзіця ў дзіцячую клініку, ці вывазьць доктара на дом. Гр-ка стала прасіць і гаварыць, што ў яе дома засталося шчэ адно малое дзіця і што яна прынесла гэта дзіця ў амбулаторыю з той прычыны, што бліжэй. Але ўсё гэта не памагло.

Цікава ведаць, чаму гэта дактары амбулаторыі не аказалі хуткай дапамогі дзіцяці, а старыка выгналі абувацца за дзьверы?

Хворы.

НОВЫЯ КНІГІ.

Выйшлі з друку і паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кніжкі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

1. „З дымам-пажарам" Алеся Ляжневіча. Рэвалюцыйная п'еса ў 3-х дзеях.
2. «Rolnik wzorowy» Мінчыцкага К.
3. «Аб рабоце ў вёсцы». Даклад і заключнае слова на XV партзьезьдзе УсеКП(б) Молатава В. М.
4. „Бунт Моці-Гёдза"—апавяданьне для дзяцей Кіплінга.

ШАХМАТЫ № 1.

11-II—1928 г. Пад рэдакцыяй А. Каспэрскага.

Эцюд Л. І. Кубеля—Ленінград (з кнігі аматараў задач і эцюдаў № 2).



Белыя пачынаюць і робяць нічыю.

Бел.—Крh5, Фd1; п. c2
Чорн.— Крe5, Cd4, Кh1; п. g2.

Хроніка.

На апошнія пасяджэньні шахматна-шашачнае сэкцыі ВСФК Бел. пастаноўлена: 1) шахматныя і шашачныя чэмпіянаты Менску распачаць не пазьней 1 сакавіка. Пэрсанальна запрашаюцца мацнейшыя ігракі гораду і па далегацыі ад саюзаў, Чырвонай арміі і вучняў-пяраможцы турніраў, 2) правесьці чэмпіянаты па шахматах і шашках Менску між жанчынамі; запісваюцца па гуртках і ў ВСФК Бел. Рэвалюцыйная, 2, 3 паверх.

Пачаўся турнір гарадоў БССР па перапісцы, удзел прымаюць: 1) Барысаў, 2) Віцебск, 3) Гомель, 4) Клімавічы, 5) Магілеў, 6) Менск, 7) Полацак, 8) Бабруйск, 9) Слуцак і 10) Рэчыца; далейшы запіс у гэты самы турнір прадоўжан.—Вызываем Мазыр і Воршу. У Менску турнірны камітэт: Розэнталь, Шукевіч-Трацьцякоў і А. Каспэрскі.

Наогул, шахматна-шашачная гульня ў Менску значна пашыраецца: у гуртках адбываюцца турніры ў клюбах Карла Маркса, савгандзьслужачых, скуранікаў, Леніна і на скур. заводзе; чытаюцца лекцыі на тэорыі гульні і адбываюцца рэгулярныя заняткі.

У клюбе савгандзьслужачых былі даны два сэансы адначасовае гульні ў шашкі 16-I І. Гардонам +18—2=7; 4-II Вакштэйнам + 37—3=2.

Апавяшчэньне.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

У нядзелю, 12-га лютага, а 5 гадз.—фракцыя праўленьня ЦДА, а 7 гадз.—пасяджэньне праўленьня Дому. На пасяджэньні фракцыі Дому выклікаюцца т. т. Мельнік, Ільін, Кіріллін, Балуга, Відрынайніс, Елізаровіч, Шурскі, Кірушына, Бучукас, Гаўроінская і Меркіс.

ПАПРАЎКА.

У № 35 (2223) нашай газэты—ад 10 лютага г. г. у аддзеле «Пазыка ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі» у заметцы „Менску трэба падагнацца" на недагляду карэктура ўкралася памылка:—надрукавана «толькі на 35.000 руб.», а ТРЭБА „ТОЛЬКІ НА 3.500 руб.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 11

Менскага Гарадзкога Савету

ад 8 лютага 1928 г.

аб часе запальваньня дамавых ліхтароў.

Менскі Гарадзкі Савет пастанаўляе:

1. Устанавіць наступны час запальваньня і гарэньня дамавых ліхтароў:

МЕСЯЦЫ.	Час запальваньня.	Час тушэньня.
Студзень	17 г. 30 хв.	6
Люты	18	5 г. 30 хв.
Сакавік	19	4 г. 30 хв.
Красавік	19 г. 30 хв.	3 г. 30 хв.
Май	21	3 г. —
Чэрвень	не запальваць	
Ліпень.	таксама.	
Жнівень запальваць з 15-8	21	3
Верасень	20	4
Кастрычнік	19	5
Лістапад	18	6
Сьнежань	17	6 г. 30 хв.

2. Нагляд за выкананьнем гэтай пастановы ўскладаецца на Міліцыю.

3. Вінаватыя ў невыкананьні гэтай пастановы будуць карацца ў адміністрацыйным парадку—штрафам да 100 рублёў ці прымусовымі работамі да 1 месяца.

4. Гэта абавязковая пастанова ўваходзіць у сілу праз 7 дзён з дню апублікаваньня.

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету ЯЦКЕВІЧ.
Сэкратар ПАСЫНКОЎСКІ.

ТЭАТР-КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
Надзеля, 12-II. „Бакханкі", трагэдыя ў 3-х дзеях. Паказ для шэфтаварыства Дзяржстраху. Пачатак а 8 з пал. гадз. вечара.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР.
Субота 11-II. „Овечий источник".
Усе білеты праданы.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». — Грандыёзны фільм — „Из-под сводов мечети". Драма ў 7 частк. Наступная пастаноўка—„Конец Санкт-Петербурга".

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Мастацкі баявік—вялікая ўсходняя пастаноўка „Трижды проданная" („ТАМИЛА"). У 7 частк. Штодня—4 сэансы.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». — З-ЦІ ТЫДЗЕНЬ У МЕНСКУ! — —) „В А Р'Е Т Э". (— Пачатак сэансаў у 7, 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. увечары.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ". Грандыёзны трукавы фільм „Отрезанные от мира". 1-я серыя ў 8 частк.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 13

МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА САВЕТУ

10 лютага 1928 г.

аб працягненьні дзейнасьці абавязковай пастановы № 7 ад 1-га лістапада 1926 г. аб кватэрнай плаце.

Менскі Гарадзкі Савет пастанаўляе:

Пацьвердзіць дзейнасьць абавязковай пастановы № 7 ад 1 лістапада 1926 году аб кватэрнай плаце на 1928 год.

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету Яцкевіч

Сэкратар Пасынкоўскі.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Каапэрат. кніжка № 2348 Каблая Л. выд. Барысаўскім ЦРК.

— Службовая адносіна формы № 4, Сулко М І., выд. 9-м палком суваві.

— Сяброўская кніжка № 1128, Сьвятлоўскай, выд. саюзам працы мастацтва.

— Асабовае пасьведчаньне Хрыпача А. Е., выд. Чарэйскім РВК кв. 267.

— Пашпарт Шкатулу М. П., выд Чэрвенскім РВК 8-V—27 г. кв. № 268.

— Пасьведчаньне аб месцы працы Шкатула М. П., выд. Чэрвенскім РККОВ 8-V—27 г., кв. № 269.

— Пасьведчаньне Шкатулка М. П., выд. ст. Лядзінскім с.-сав. 9-V—27 г. кв. № 270.

— Пасьведчаньне аб месцы працы Шкатула М. П., выд. Жэлезьнянскім РВК Арцёмаўск. акр. кв. 271.

— Вучотна-конская кніжка Цалко А., выд. Караліскім РВК. № 272.

— Дапрызыўн. карт. № 92 Каца М. Е., выд. Магілеўскім тэрыялком, кв. 277.

— Студэнцк. білет Каца М. А., выд Белдзяржмутахнікумам, кв. 278.

— Паўнамоцтва на падпісаньне дагавораў і вэксэляў на імя старшыні праўленьня Чарэйскага крэдытнага с.-г. т-ва Хрыпача А. Е., кв. 279.

— Пячатка Чарэйскага крэдытнага с.-г. т-ва „Земляроб", кв. 280.

— Вэксаль вартасьцю ў 50 кап. за подпісамі старшыні праўленьня А. Хрыпача і сябра праўленьня Рачанава, кв. 281.

— Студэнцк. пасьведчаньне Вярцэня І. Ф., выд. мутэхнікумам, кв. 282.

— Чырвонаарм. кніжка № 49 Калецкага У. І., выд. 5-м палком, кв. 283.

— Каапэрац. кніжка Цітава В. В., выд. МЦРК, кв. 284.

— Пасьведчаньне Цітава В. В., выд. ОГПУ на права дабыцьця аружжа, кв. 285.

— Пасьведчаньне № 342533-5 Дайнэка С. М., выд ЦВК БССР, кв. 286.

— Лекавая кніжка Кантаровіча С. П., выд. Менакрстраккас, кв.